Чаго чакаць ад «Белай вежы»

СТАР. 3

Падручнік, які задаволіць усіх?

СТАР. 3

Прымайце лекі правільна

СТАР. 5

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

7 ВЕРАСНЯ 2016 г. СЕРАДА № 172 (28282)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Свабоднае волевыяўленне

ГАЛАСАВАННЕ НА ВЫБАРАХ НЕ ПАВІННА БЫЦЬ ШТУЧНЫМ

Аб гэтым Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў у час рабочай сустрэчы са старшынёй Цэнтрвыбаркама Лідзіяй Ярмошынай.

«У нас пачалося датэрміновае галасаванне. Я хацеў бы звярнуць і вашу ўвагу, і тых, хто арганізоўвае выбары, адказвае за іх на месцах, каб не было ў нас нічога штучнага, каб мы не гналі людзей на выбары, каб мы годна іх правялі, каб гэта сапраўды было свята і мы разумелі, што робім гэта для сваёй краіны і народа», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адзначыў, што, вядома, яму хацелася б, каб на выбары прыйшло як мага больш людзей. «Гэта паказчык сувязі паміж уладай і народам, паказчык ацэнкі людзьмі парламенцкіх выбараў, ролі дэпутатаў, парламента ў жыцці нашага грамадства і дзяржавы. Але, тым не менш, падкрэсліваю: заганяць людзей на ўчастку не трэба, трэба іх папрасіць. Трэба папрасіць, каб людзі прыйшлі і прагаласавалі», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.

Пры гэтым, адзначыў Аляксандр Лукашэнка, ёсць меркаванні, што Захад дасць нізкую ацэнку выбарам, калі будзе вялікі працэнт датэрміновага галасавання. «Я думаю, нам гэтага баяцца не трэба. Вельмі сур'ёзныя сродкі масавай інфармацыі прааналізавалі іншыя краіны — там ніхто не напружваецца з гэтай нагоды. Надвор'е на гэтым тыдні будзе выдатнае, людзі будуць сядзець на лецішчах, на беразе возера, будуць займацца сваімі пытаннямі, і кожны будзе выбіраць момант, калі яму лепш прагаласаваць», — падкрэсліў беларускі лідар. Паводле слоў Прэзідэнта, у сувязі з займанай пасадай яму было б лепш прагаласаваць датэрмінова, але ён збіраецца прагаласаваць у нядзелю.

«Пачне дзейнічаць новы парламент, ціха, спакойна будзем жыць і працаваць. Галоўнае, каб гэтая палітычная кампанія не парушыла міру і спакою ў нашай краіне. Нам яны вельмі неабходны. Таму я звяртаюся да людзей, каб яны прыйшлі і прагаласавалі на гэтых выбарах так, як лічаць патрэбным», — заклікаў Аляксандр Лукашэнка.

На сустрэчы было адзначана, што Беларусь прытрымліваецца найважнейшых міжнародных стандартаў, накіраваных на забеспячэнне назірання за выбарамі, на дэмакратычнасць працэдуры галасавання і, натуральна, адкрытасці і справядлівасці падліку галасоў выбаршчыкаў, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Самі выбары праходзяць ва ўмовах галоснасці, празрыстасці.

ВЕРАСНЁЎСКАЕ СЕНА

Жыхары вёскі Любонічы Кіраўскага раёна суседзі Васіль ЛАЗАКОВІЧ і Іван САЛАНОВІЧ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй РАЎКОЎ, міністр абароны:

«Беручы пад увагу існуючы патэнцыял, можна смела заявіць пра гатоўнасць арганізацый абароннага сектара эканомікі Рэспублікі Беларусь да поўнамаштабнага ўдзелу ў выкананні заданняў дзяржаўнага абароннага заказу Расіі сумесна з прадпрыемствамі ваенна-прамыслоўвага комплексу нашых расійскіх калег. Неабходна шырэй выкарыстоўваць навуковыя і вытворчыя магчымасці дзвюх краін пры распрацоўцы новых узораў узбраенняў, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі ў рамках дзяржаўных праграм».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 07.09.2016 г.

Долар ЗША	1,9612	▲
Еўра	2,1895	▼
Рас. руб.	0,0302	■
Укр. грыўня	0,0730	■

З ВЫБАРАМ ВЫЗНАЧЫЛІСЯ

Як праходзіў першы дзень датэрміновага галасавання

Ужо ўчора адкрыліся ўчасткі для датэрміновага галасавання. Выканаць свой грамадзянскі абавязак прыходзілі не толькі пенсіянеры, але і студэнты, маладыя мамы, людзі сярэдняга ўзросту. Як правіла, прагаласаваць раней вырашылі з вельмі простай прычыны — каб вызваліць выхадныя для іншых спраў і планаў. Карэспандэнты «Звязды» пабывалі на самых розных выбарчых участках і даведаліся, наколькі актыўна праходзіў першы дзень датэрміновага галасавання.

Галоўнае — узрост і адукацыя

Учора а 10-й гадзіне раніцы адкрыліся ўчасткі для датэрміновага галасавання. Ужо праз некалькі хвілін на сталічным участку № 549, у адным з корпусаў БНТУ, з'явіліся першыя выбаршчыкі. Калі практычна на кожным пашпарце ёсць вясёлая вокладка, значыць, галасаваць прыйшлі студэнты.

На ўчастку для галасавання спакойна. Раз на некалькі хвілін прыходзіць па 2-3 чалавекі, якія ўжо вызначыліся, за каго аддадуць свой голас.

Дзяўчаты Настасся і Лізавета да выбару падышлі сур'ёзна — вывучылі перадвыбарчыя праграмы ўсіх кандыдатаў. Яны сыходзяцца ў думцы, што галоўнае — гэта ўзрост, ён павінен быць у кандыдата сярэднім, каб той мог разумець усіх. Таксама важная партыйная прыналежнасць: як можна галасаваць за таго, хто з'яўляецца прадстаўніком партыі, аб існаванні якой ты ні разу нават не чуў? А вось зарплата значэння не мае, таму што яна нічога не гаворыць аб асабістых якасцях кандыдата. Студэнткам хацелася б, каб выбраны дэпутат заняўся распрацоўкай рэформы адукацыі, праблемамі парковак, якасці дарог, капітальных рамонтаў у дамах.

Два цёзкі, Артуры, вучацца на трэцім курсе, аднак ужо задумваюцца аб тым, што б яны самі маглі прапанаваць выбаршчыкам. «Студэнта можна назваць універсальным грамадзянінам: мы прыслухоўваемся да думак нашых бацькоў, а таксама добра ведаем пазіцыю моладзі і разбіраемся ў сучасных тэндэнцыях. Гэта дазваляе прадстаўляць інтарэсы шырокага кола», — разважаюць хлопцы. Пакуль жа сярод кандыдатаў аддаюць перавагу тым, у каго вышэйшая адукацыя і вопыт працы на кіруючых пасадах.

СТАР. 2

Фота БЕЛТА.

Сярэбраны прызёр Алімпіяды ў Рыа Іван ЦІХАН прагаласаваў у Гродзенска-Занёманскай выбарчай акрузе №49.

■ Экспартны патэнцыял

КУЖАЛЬ ЯК АДКРЫЦЦЁ

Чаму беларускія вытворцы не цэняць айчынны лён?

Знайсці якаснае льняное беларускае адзенне ў Беларусі не так і лёгка. І гэта пры тым, што якасныя льняныя тканіны выпускаюцца.

Па словах начальніка ўпраўлення развіцця асартыменту Аршанскага льнокамбіната Ігара ЕШЧАНКІ, у Заходняй Еўропе і ЗША культура спажывання льну сёння на вышыні. Пра гэта сведчаць і высокія аб'ёмы экспартных паставак беларускіх ільняных тканін у адпаведныя напрамкі. Чаму ж нашы прадпрыемствы да гэтага часу недаацэньваюць нацыянальны здабытак? Пад пытаннем стаіць нават рэалізацыя нашумелага праекта беларускіх ільняных джынсаў. Падрабязней аб гэтым «Звяздзе» расказаў спецыяліст айчыннай ільногаліны Ігар Ешчанка.

— Актуальнасць здабычы лёну і вытворчасці з яго прадукцыі сёння расце. Ільняное валакно — адно з тых, што мае шэраг пераваг перад сінтэтыкай. Сёння вялікая колькасць ільняных тканін ідзе на экспарт, аднак вытворцы тканін ніколі не забываюць пра патрэбы беларусаў, якія ўсё ж досыць сціплыя. Гаворка ідзе не толькі пра тканіны, але і гатовыя вырабы. Таксама хачу адзначыць, што Расія не самы буйны спажывец лёну нашай краіны. Аршанскі льнокамбінат мае даўнія дзелавыя сувязі па пастаўках прадукцыі ў буйным аб'ёме з краінамі Заходняй Еўропы, ЗША, Бразіліяй, Турцыяй. Гэта асноўныя спажыўцы, якія купляюць тканіны для перапрацоўкі і ў першую чаргу добра ведаюць кан'юнктуру. Беларусь сёння з'яўляецца важкай часткай глабальнага льнянога рынку.

СТАР. 2

Фота БЕЛТА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Дзясяткі чалавек загінулі падчас тэракту ў Кабуле

У цэнтры афганскай сталіцы Кабуле вечарам 5 верасня адбыўся яшчэ адзін (трэці) магутны выбух. Як паведамляюць інфармагенцтвы, пазней у гэтым раёне было чуваць гукі стральбы.

Мэтай нападзення стаў будынак гуманітарнай арганізацыі CARE. Аднаго з арганізатараў узрыву ўдалося ліквідаваць. Больш падрабязная інфармацыя аб здарэнні пакуль не паступала. Раней два моцныя выбухі прагрымелі каля будынка Міністэрства абароны. Паводле папярэдняй версіі, мэтай дваіх тэрарыстаў-смяротнікаў былі высокапастаўленыя сілавікі. У выніку колькасць загінулых склала як мінімум 30 чалавек, дзясяткі паранены. Адказнасць за тэракт узяў радыкальны рух «Талібан».

Расія задумалася аб заахвочванні жанчын, якія нараджаюць да 30 гадоў

У Мінпрацы разглядаюць магчымасць увядзення дадатковых мер падтрымкі маці, якія нарадзілі дваіх дзяцей да 30 гадоў. Пра гэта паведаміў кіраўнік ведамства Максім Тапілін. Паводле яго слоў, самая вялікая праблема заключаецца ў тым, што ўзрост з'яўлення першага дзіцяці ў расійскіх жанчын павялічваецца. Тапілін дадаў, што не бачыць нічога дрэннага ў тым, каб жанчына нарадзіла пасля 30 гадоў. «Але, вядома, з пункту гледжання здароўя маці і магчымасці нараджэння трэцяга-чацвёртага дзіцяці, лепш, калі жанчына нараджае дваіх дзяцей да 30 гадоў», — падкрэсліў ён.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Абараніць сваё сэрца магчыма, проста займаючыся прыемнымі справамі

Людзі пенсійнага ўзросту, якія праводзяць у садзе, на рыбалцы ці на прагулцы ўсяго па паўгадзіны ў дзень, самі таго не ведаючы, скарачаюць рызыку смяротнага сардэчнага прыступу больш чым удвая. Гэта паказала даследаванне 2456 чалавек 65-74 гадоў, піша The Telegraph. Для паляпшэння стану арганізма не патрабуецца прыкладаць асаблівых намаганняў. У цэлым умераны ўзровень фізічнай актыўнасці мінімум чатыры гадзіны на тыдзень даваў зніжэнне рызыкі смерці ад праблем з сэрцам на 54% (на 31% скарачалася рызыка сардэчнага прыступу і інсульту). Людзі, якія мелі вышэйшы ўзровень актыўнасці, маглі пахваліцца 66-працэнтным зніжэннем паказчыкаў смерці ад праблем з сэрцам і 45-працэнтным зніжэннем рызыкі інфарктаў ці інсультаў.

■ Сугучча

АРТЭФАКТ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

ЛІТАРАТАРЫ З 14 КРАІН АБМЕРКАВАЛІ РОЛЮ КНІГІ Ў СУЧАСНЫМ ГРАМАДСТВЕ ПАДЧАС «КРУГЛАГА СТАЛА» Ў МІНСКУ

Яны расказвалі пра ўвасобленыя ў жыццё міжнародныя літаратурныя праекты і планы на будучыню. Абмяркоўвалі сучаснасць, у якой, несумненна, значнымі застаюцца вобраз і спадчына нашага першадрукара Францыска Скарыны. За дзясятым, юбілейным «круглым сталом», што прайшоў у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі і па традыцыі адкрыў Дзень беларускага пісьменства, сабраліся прадстаўнікі Беларусі, Літвы, Расіі, Вялікабрытаніі, Казахстана, Сербіі, Славакіі, Кітая, Таджыкістана і іншых краін. Арганізатарамі «круглага стала», які атрымаў назву «Сугучча: слова Скарыны ў сучасным свеце», выступілі Міністэрства інфармацыі, Выдавецкі дом «Звязда», выдавецтва «Мастацкая літаратура» і Саюз пісьменнікаў Беларусі.

СТАР. 6

Фота Кастуся ДРОБАВА.

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал!

ПАДПІШЫСЯ І ВЫЙГРАЙ!

Умовы рэкламнай гульні чытайце на 6-й старонцы

СКЛАДАНЫ ШЛЯХ ПРАХОДЗІМ ГОДНА

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю інфармацыйнаму агенцтву ТАСС для тэлефільма, прысвечанага 25-годдзю СНД, і тэлепраграме «Формула ўлады».

Падчас цёплай і адкрытай гутаркі вялікая ўвага была ўдзелена тэмам інтэграцыі на постсавецкай прасторы і далейшаму развіццю інтэграцыйных структур, а таксама беларуска-расійскіх адносін, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

«СНД з'яўляецца вялікай палітычнай і дыпламатычнай пляцоўкай, дзе абмяркоўваюцца глабальныя пытанні і потым даюцца арыенціры, у якім кірунку будзем рухацца. У нас з'явіўся і Еўразійскі эканамічны саюз. Гэта эканоміка, эканамічная інтэграцыя, мытныя праблемы. Без палітыкі і ваенных аспектаў. ЕАЭС — гэта эканоміка», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы таксама закрануў функцыянаванне АДКБ. «Гэта ваенна-палітычны саюз. Так, гэта не НАТА, не натаўскі блок, ён не мае такой моцы і сілы. Але гэта іншая структура, дзе стаяць пэўныя задачы. Дапусцім, Беларусь і Расія на заходнім напрамку — адзіная армія, адзіная групоўка. Гэта пытанні АДКБ. І самая глыбокая інтэграцыя — гэта будаўніцтва Саюзнай дзяржавы, — перакананы Прэзідэнт. — Тут і эканоміка, і палітыка, і сумесныя парасткі органаў улады. Гэта вельмі глыбокая форма інтэграцыі».

Што тычыцца беларуска-расійскіх адносін, то, на думку кіраўніка дзяржавы, Беларусь і Расія прайшлі велізарны шлях, каб не разысціся, не разарваць адносіны і застацца блізкімі сябрамі і ў эканоміцы, і ў палітыцы, і ў грамадскім жыцці. «Складаны шлях, але мы яго праходзім годна, хоць і з некаторымі шурпатасцямі, — перакананы Аляксандр Лукашэнка. — Мы вельмі шмат зрабілі ў плане адзінства, каб народы не былі пакрыўджаныя распадам Савецкага Саюза — больш, чым хто-небудзь з постсавецкіх рэспублік. Мы прынялі шмат рашэнняў, якія ўраўноўваюць беларусаў і расіян у правах. Адышлі ад той прорвы, якая магла быць паміж Беларуссю і Расіяй і якая вызначалася там, пад Смаленскам. Але было б няпраўдай, калі б мы гаварылі толькі пра гэты станоўчы бок. У нас маса праблем. Мы, напэўна, у чымсьці не разумелі Расію. Расія хапалася то за газавую, то за нафтавую трубу, то не прапускала нашы тавары. Мы недзе, напэўна, сябе не зусім правільна паводзілі, хоць імкнуліся «старэйшага брата» не крыўдзіць і не злавадзіць — гэта таксама праўда».

Кіраўніку дзяржавы, акрамя палітычных і эканамічных, былі зададзены і пытанні асабістага характару, у тым ліку — пра што ён марыць. «Вы ведаеце, я хацеў бы, каб людзі ніколі, зазіраючы ў кашалёк або сваю кішэню, не думалі пра тое, што ім на нешта не хапае, — адказаў Аляксандр Лукашэнка. — Заўсёды частцы народа чагосьці не хапае, гэта натуральна. А я б хацеў, каб людзі ў Беларусі ніколі аб гэтым не турбаваліся — вось яна, мая адзіная мара».

Разам з тым кіраўнік дзяржавы выказаў погляд, што людзі павінны і самі думаць пра сваю будучыню, і тады сваё жыццё можна забяспечыць. Кіраўнік дзяржавы прывёў канкрэтны прыклад: «Некалькі гадоў таму мною быў падпісаны ўказ і прынята рашэнне аб развіцці аграэкатурызму: каля трох тысяч прадпрымальных сем'яў стварылі ўласныя, лічыце, прадпрыемствы, пабудавалі вёскі, хаты, дзе адпачываць могуць ад дзесяці да пяцідзесяці, за сотню чалавек. І гэтыя прадпрымальныя людзі жывуць нядрэнна. Чаму любы беларус не можа, паставіўшы перад сабой мэту, забяспечыць сябе і сям'ю, зарабіць? Можа. І гэта мая мара, каб у нас у Беларусі, яшчэ раз падкрэслю, ніколі, зазіраючы ў кашалёк і кішэню, не перажывалі аб тым, што не хапае грошай. Я гэта зраблю».

КУЖАЛЬ ЯК АДКРЫЦЦЁ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Наколькі канкурэнтаздольныя беларускія льняныя тканіны?

— Гістарычна склалася, што ў нашай краіне расце лён, які пры перапрацоўцы на льнозаводзе дае больш кароткага валакна, чым доўгага, у адрозненне ад Францыі, дзе ўсё з дакладнасцю наадварот. Вытворчасць у нас у большай ступені арыентавана на перапрацоўку кароткага валакна. Аднак ва ўсім свеце прадукцыя з доўгага валакна нашмат больш запатрабаваная. Таму ў Беларусі выкарыстоўваюць найлепшыя сусветныя напрацоўкі, напрыклад метад катанізацыі (перапрацоўкі кароткага валакна на спецыялізаваным абсталяванні і атрыманне валакна і нітак новага пакалення). Раней з кароткага льнянога валакна рабілася толькі мешкавіна. Сёння мы ў стане з такога валакна пашыць вырабы якасна новага ўзроўню. Такія вырабы ўжо паспелі зарэкамендаваць сябе на міжнародных выставах, і на іх ужо ёсць попыт.

— У льняной тканіне часта выкарыстоўваюцца спецыяльныя дамешкі. Якія з іх сёння найбольш запатрабаваныя?

— Беларуская вытворчасць арыентуецца на кан'юнктуру сусветнага рынку. Мы робім стаўку на 100% натуральныя тканіны. У тым ліку працуем над ільнянымі тканінамі з выкарыстаннем бавоўны. Ёсць група вырабаў з дабаўленнем поліэфіраў. Акрамя таго, згодна з апошнімі павевамі моды, выкарыстоўваюцца эластанавыя ніткі для атрымання камфортных тканін для адзення. Задаюць попыт, як заўсёды, спажывец і рынак. Тэндэнцыі моды, напрамкі развіцця тэкстылю таксама адсочваюцца.

— Дарэчы, а якія адрозненні ў пажаданнях замежных і айчынных спажыўцоў ільняных тканін?

— Спажыўцы купляюць у асноўным стапрацэнтна льняныя тканіны без прымешак. Гэта трэнд, які ўтрымлівае свае пазіцыі на рынку ўжо доўгі час. І Еўропа, і Амерыка выкарыстоўваюць менавіта натуральны лён. Аднак ёсць катэгорыя пакупнікоў, якія хочуць больш бюджэтныя варыянты, дзе прысутнічае бавоўна.

— Што неабходна беларускім вытворцам ільняных тканін, каб павысіць экспарт сваёй прадукцыі? Ёсць куды імкнуцца?

— Не перашкаджае знізіць сабекошт тканін. Асноўны наш канкурэнт — кітайскія вытворцы. Яны карыстаюцца вельмі моцнай падтрымкай дзяржавы. Не ўсе рычагі, якія выкарыстоўваюць яны, можам сабе дазволіць мы. Хацелася б, вядома, больш адкрытай канкурэнцыі на знешнім рынку. Мы спрабуем пераймать сусветны вопыт у прасоўванні айчыннай прадукцыі: выкарыстанне тэхналогій электронных продажаў, сацыяльных сетак, рэкламнай падтрымкі. Аднак пакуль што не ўсё ў нас атрымліваецца. Акрамя таго, перш чым прасунуць беларускі лён на знешнім рынку, неабходна паўдзельнічаць у шматлікіх выставах, што вельмі затратна для прадпрыемстваў. Напрыклад, турэцкія вытворцы падчас такога ўдзелу атрымліваюць кампенсацыю ад 50% да 100% сваіх выдаткаў ад дзяржавы. Мы такой падтрымкі пакуль не маем.

Акрамя таго, сёння шмат гаворыцца пра ўступленне Беларусі ў СГА. Спадзяёмся, што наша краіна паспяхова правядзе гэтыя перамовы. Ужо цяпер мы бачым, што нашы суседзі, уступіўшы туды, маюць пэўныя прэферэнцыі. Вельмі не хацелася б адставаць ад усяго свету. Таксама прадпрыемствы пастаянна сочаць за новымі тэхналогіямі і займаюцца ўдасканаленнем свайго абсталявання. Усё гэта дапамагае пашыраць асартыментную лінейку, асучасніваць тэхналогіі атрымання як традыцыйных, так і новых тканін. Мы павінны ўтрымаць сваё становішча на сусветным рынку і нават пашырыць яго.

— Чаму беларускія швейныя прадпрыемствы не так часта звяртаюцца па льняныя тканіны айчыннай вытворчасці?

— Асноўныя праблемы, хутчэй за ўсё, у непаразуменні. Уплывае яшчэ і тое, што многія прадпрыемствы працуюць па давальніцкіх схемах, і ў іх значна зменшаны свае службы маркетынгу і распрацоўкі. Такім кампаніям вельмі цяжка арыентавацца і калі ў іх у штаце застаецца, напрыклад, толькі адзін мадэльер-канструктар. Лён — вельмі няпросты матэрыял, і з ім трэба ўмець працаваць. Але варта адзначыць, што апошнія два гады лён становіцца вельмі папулярным ва ўсім свеце. Няма сусветных брэндаў, якія б не працавалі з лёнам. Беларускія прадпрыемствы, як бы гэта парадаксальна ні гучала для краіны, дзе нават на гербе намаляваны лён, працуюць з ім вельмі мала. Крыўдна, калі ідзеш на рынак ці ў краму і купляеш, напрыклад, турэцкія вырабы з беларускага льну. Айчынныя швейныя прадпрыемствы самі маглі б выходзіць на экспарт з ільняным прадуктам, але гэта адбываецца рэдка. Прычым перспектывы было б у гэтым сектары больш, чым, скажам, гандляваць на рынках ЗША і Заходняй Еўропы баваўнянымі вырабамі. А там вельмі добра ведаюць, што такое лён, і высока яго цэняць.

— Ці можна сказаць, што на рынку льнянога адзення сёння ёсць дэфіцыт?

— Хутчэй за ўсё так. Але я б не стаў вылучаць рынак ільнянога адзення асобна. Калі звярнуць увагу на сусветныя брэнды, а яны ўжо ў краіне даўно прысутнічаюць у вялікім аб'ёме, то лён займае ад 8% да 15% у іх асартыментных лінейках. Ён ёсць ва ўсіх. Аднак беларускія швейныя прадпрыемствы мала працуюць з ільном. Нам гэта незразумела яшчэ і таму, што цяпер лён становіцца сусветным трэндам. Пра гэта сведчыць і рост экспарту тканін нашага прадпрыемства. Мы назіраем за актыўнасцю кітайскіх кампаній, якія імкнуцца заняць новыя нішы на тэкстыльным рынку. Вельмі добра развіваецца і індыйскі рынак. Там раней ніколі не рос лён, а сёння ўжо нямала прадпрыемстваў, якія займаюцца вытворчасцю льняной тканіны, перапрацоўкай, вырабам адзення. Беларусам ні ў якім разе нельга страціць рынак. У нашай краіны ёсць усё для таго, каб развіваць ільняную тэкстыльную і швейную галіны і з гэтым прадуктам выходзіць на экспарт. Нам цяпер у першую чаргу трэба разуменне швейных прадпрыемстваў і жаданне гэтым займацца. Напрыклад, баваўняная джынсавая тканіна сёння на піку моды. Мы можам ужо сёння сваім пакупнікам прапанаваць гэты стыль, заснаваны на лёне, што ў перспектыве павінна стаць нашай канкурэнтнай перавагай. На рынку джынсаў сёння цяжка канкураваць. Там замацаваліся Турцыя і краіны Азіі. Але мы можам прапанаваць такі інавацыйны прадукт, як ільняныя джынсы. І гэта павінна стаць прарыўным праектам. Бо льняная тканіна сёння самая спрыяльная для цела чалавека. Беларусы павінны разумець, што гэта сапраўды золата, наша багацце, нацыянальны прадукт, які адпавядае патрэбам усяго свету.

— Мы бачым, што сёння льняная джынсавая тканіна гатовая. Але таксама няма прадпрыемстваў, якія гатовы былі б з ёй працаваць. Калі ж беларусы ўбачаць ільняныя джынсы на прылаўках нашых магазінаў?

— Варта адзначыць, што ў краіне практычна няма прадпрыемстваў, якія працуюць з бавоўнай для пашыву джынсаў. А каб працаваць якасна з ільнянымі джынсамі, трэба спачатку мець досвед працы з бавоўнай. Лён — адна з самых трывалых тканін. Нашы тканіны прайшлі не адну сотню тэстаў, і ўсе паказчыкі сведчаць аб тым, што яна ні ў чым не саступае баваўнянаму джынсу. Акрамя таго, ільняная тканіна вельмі камфортная. Яна мае большую паветрапранікальнасць. Хацелася б, вядома, каб беларускія швейныя прадпрыемствы ўжо сёння зацікавіліся нашымі распрацоўкамі. Мы падрыхтавалі пакеты прапаноў для беларускіх кампаній. Але да восеньскіх выстаў у Расіі, Заходняй Еўропе льнокамбінат таксама гатовы. Мы плануем, што ўзімку некаторыя кампаніі паспрабуюць стварыць шэраг пробных варыянтаў джынсаў, а вясной наступнага года яны паступяць у краму.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.
Kryzhevich@zviazda.by

З ВЫБАРАМ ВЫЗНАЧЫЛІСЯ

Датэрмінова прагаласаваць, каб планаў не мяняць

А дзясятай гадзіне раніцы перад дзвярыма ўчастка для галасавання №28, што ў вёсцы Копішча Мінскага раёна, пачалі збірацца ахвотныя выканаць свой грамадзянскі абавязак. Звычайна першымі прыходзяць на ўчастак пенсіянеры. Але на гэты раз іх апярэдзілі 30-40-гадовыя выбаршчыкі.

— Гэта і зразумела. У новым мікрараёне, які тут вырас за апошнія гады, жыве шмат маладых сем'яў, — тлумачыць старшыня ўчастка Таццяна Маскалік. — Наогул, у нас самы вялікі ўчастак на тэрыторыі Бараўлянскага сельскага Савета — каля 3 тыс. выбаршчыкаў. Сорак юнакоў і дзяўчат сёлета будуць галасаваць упершыню. Ім уручым віншавальныя паштоўкі з подпісам старшыні Цэнтральнай выбарчай камісіі Лідзіі Ярмошынай.

Таццяна і Іван прыйшлі аддаць свой голас за кандыдата, які ім імпануе, разам з дачушкай.

— Няхай малая прывыкае. Яна ж таксама некалі будзе галасаваць, — жартуе тата. — Непасрэдна ў дзень выбараў нас не будзе дома, на выхадныя збіраемся да бацькоў: трэба дапамагчы сабраць яблыкі. Вось і галасуем датэрмінова, каб планаў не мяняць. А паколькі лічым, што ўдзел у гэтай важнай кампаніі абавязковы, то прыйшлі выканаць свой грамадзянскі абавязак. Мы нядаўна перабраліся ў гэты мікрараён, тут нам падабаецца. І мы спадзяёмся, што кандыдат, за якога прагаласавалі, зробіць усё, каб наш мікрараён быў яшчэ больш утульным, прыгожым, зручным для пражывання.

За свайго кандыдата

Яўгенія Ігнатаўна Кузуб прыйшла на ўчастак для галасавання ў ліку першых выбаршчыкаў.

— Чаму ж не прагаласаваць, калі ўчастак знаходзіцца побач з домам? Па дарозе на рынак вырашылі з сынам зайсці і выканаць свой грамадзянскі абавязак, — ахвотна тлумачыла суразмоўца.

— А сын чаму галасуе датэрмінова? — пытаюся ў Валерыя Аляксандравіча.

— Хто ж мяне тады на машыне павязе ў Бярозу? — весела пытаннем на пытанне адказала за сына маці.

Яўгенія Кузуб, паводле яе слоў, 37 гадоў адпрацавала на вядомым брэсцкім прадпрыемстве «Брэстгазаапарат». Сказала, што і на вытворчасці заўсёды вызначалася актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, не памяняла сваіх поглядаў і на пенсіі. Тым больш што адна з кандыдатаў у дэпутаты па гэтай акрузе добра знаёмая ветэрану працы, нейкі час яны побач працавалі на прадпрыемстве. Таму са сваім голасам выбаршчыца вызначылася даўно.

— Нашы выбаршчыкі ў асноўным сталыя людзі, — расказвае старшыня камісіі выбарчага ўчастка №23 Брэсцкай-Заходняй выбарчай акругі №1 Ларыса КРУПТА. — Гэта старая забудова Брэста. Адразу пасля таго, як ў 9.55 мы апячаталі скрыню для галасавання і падрыхтавалі неабходныя дакументы, на ўчастак завіталі адна за адной дзве пенсіянеркі. Не скажу, што ў першыя часы першага дня датэрміновага галасавання грамадзяне праяўляюць высокую актыўнасць, але, самі бачыце, пакрысе людзі ідуць.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У спісы ўключана 1640 чалавек. Гэта сярэдні па гарадскіх памерах участак, удакладняе Ларыса Уладзіміраўна. На галасаванне па месцы жыхарства ўжо запісаліся 70 чалавек. Думаю, што названы спіс яшчэ значна папоўніцца. У асноўным яго складаюць людзі 1929—1932 гадоў нараджэння. Праўда, ёсць адна 84-гадовая пенсіянерка (пра яе калегі расказвалі), якая шмат гадоў прыходзіць у асноўны дзень выбараў. Жанчына прыходзіць з букетам астраў са сваёй дачы, каб павіншаваць усіх прысутных з важнай палітычнай падзеяй. Кветкі ўвесь дзень упрыгожваюць адзін са сталоў участка.

— На мінулых выбарах я ездзіла па кватэрах з урнай, — уступае ў размову член участковай камісіі Кацярына Налівайка. — Абсалютная большасць з ліку старых нямоглых людзей сустракае камісію ў святочным адзенні, яны імкнуцца пагаварыць, нават стараюцца запрасіць на чай. Людзі пажылыя, хворыя, успрымаюць такія візіты як знак увагі да сябе. Таму да выездаў рыхтуемся адказна.

«Працаваць адказна, з душой»

Такое пажаданне выказаў дэпутатам парламента ветэран Вялікай Айчыннай вайны Яўген ДАЛІДОВІЧ, які ўчора зрабіў свой выбар на выбарчым участку №15 Гродзенскай-Цэнтральнай акругі №51.

Гэты ўчастак, які размешчаны ў галоўным корпусе ГрДУ імя Янкі Купалы, адзін з 686 на Гродзеншчыне. Старшыня ўчастковай выбарчай камісіі Андрэй ГЕЦЭВІЧ зазначае, што яе члены ўжо правялі даволі значную работу. Па-першае, выверылі ўсе спісы выбаршчыкаў. Па-другое, абышлі каля 700 кватэр і перадалі інфармацыю пра кожнага з пяці прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат.

— Добра, што цяпер у нас ёсць такая магчымасць пазнаёміць выбаршчыкаў з кандыдатамі ў дэпутаты, незалежна ад таго, маюць яны фінансавыя сродкі для агітацыі альбо не маюць, — лічыць Андрэй Гецэвіч. — Безумоўна, гэта на карысць людзям, якія будуць галасаваць.

— Ці былі нейкія заўвагі ад назіральнікаў?

— Назіральнікі (пад імі я разумею і саміх кандыдатаў у дэпутаты, і іх давераных асоб, і цяперашніх дэпутатаў рознага ўзроўню) наведваюцца на наш участак на працягу апошняга тыдня. Учора былі назіральнікі ад доўгатэрміновай місіі АБСЕ, а таксама прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый. На сённяшні момант якіх-небудзь заўваг не маем.

Не было заўваг і ў назіральнікаў ад рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» і кампаніі «Права выбару», якія ў першы дзень датэрміновага галасавання знаходзіліся на выбарчым участку.

Бюлетэні паляцелі

Гамяльчане маці з сынам Галіна і Яўген Ашыхміны на свой выбарчы ўчастак прыйшлі аднымі з першых. Кажуць, збіраюцца ад'ехаць з горада на выхадныя, таму скарысталіся сваім правам прагаласаваць датэрмінова.

— Гэта проста натуральна для мяне, — кажа Галіна. — Ну як не прыйсці і не прагаласаваць за сваю будучыню? Мы ж усе зацікаўлены жыць лепш. І таму я глядзела біяграфіі кандыдатаў у дэпутаты, іх праграмы. Важна ведаць, што кожны з іх зможа для нас зрабіць. Я галасавала за таго чалавека, які будзе сапраўды паляпшаць наша жыццё.

— Як можна галасаваць за таго, каго не ведаеш? — працягвае размову сын Яўген. — Мы ў сям'і абмяркоўвалі кандыдатуры. Параіліся і аднагалосна вырашылі, за каго аддадзім свае галасы на гэтых выбарах.

Дарэчы, участак №15, дзе мы гутарым, знаходзіцца ў інтэрнаце па вуліцы Хмяльніцкага, 108, корпус 3. Па інерцыі людзі называюць інтэрнат «хімзаводскім». Аднак не так даўно будынкі, раней замацаваныя за вядомым прадпрыемствам, перададзены на баланс гарадской жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

Сакратар выбарчай камісіі Ніна Бондзікава гаворыць, што месца галасавання для жыхароў традыцыйнае. Усе ведаюць, куды ісці, каб вызначыць сваю грамадзянскую пазіцыю. Тым не менш тут загадзя ўсё пераправерылі і падрыхтаваліся:

— Вось глядзіце самі: празрыстая урна ў нас апячатаная. Тут кабінка для папярэдняга галасавання, тут інфармацыя пра кандыдатаў, тут месца для назіральнікаў.

Назіральнікі, два маладыя мужчыны, прадстаўляюць грамадскія арганізацыі: БРСМ і «Белую Русь». Дзмітрый Тамашэнка адначае, што ўсё ідзе будзённа, без ажыятажу — што і добра.

На гэтым участку чакаюць трохі больш за дзве тысячы выбаршчыкаў. Сярод іх шмат супрацоўнікаў хімзавода, якія жывуць у гэтым і суседнім інтэрнацкіх будынках.

— Мы прайшлі па ўсіх пакоях у інтэрнаце — кожнаму ўручылі паведамленне пра выбары, — расказвае сакратар выбарчай камісіі Ніна Бондзікава. — Людзі цікавіліся біяграфіямі кандыдатаў у дэпутаты. Паралельна жыхары інтэрнатаў задаюць і іншыя пытанні, якія іх хвалююць. У асноўным яны звязаны з бытавымі ўмовамі пражывання ў інтэрнатах. Калі гэтыя пабудовы належалі хімзаводу, тут быў штат людзей, якія ўсё абслугоўвалі. Цяпер інтэрнаты перададзены ў сістэму ЖКГ, і ў людзей узнікаюць пэўныя пытанні ў сувязі з гэтым. Напрыклад, дзесьці трубу прарвала, дзесьці лямпачка не гарыць.

Між тым у пакой, дзе мы гутарым, заходзіць старшыня выбарчай камісіі Дзмітрый Чарнякоў. Ён член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, выбраны ад Гомельскай вобласці. Дзмітрый Уладзіміравіч тры гады кіруе Гомельскім хімічным заводам і пытанні перадачы інтэрнатаў з усімі іх праблемамі ведае як ніхто:

— Тут жа ўсё роўна працягваюць жыць нашы людзі. Нават калі перадавалі інтэрнаты гораду, імкнуліся па максімуме, нават наперад нешта зрабіць, каб у жыхароў як мага даўжэй не ўзнікала ніякіх праблем, звязаных з іх станам. І цяпер працягваем вырашаць многія праблемы. Трэба пакасіць — пакасілі. Нешта замяніць — замянілі.

Дар'я КАСКО, Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Святлана ЯСКЕВІЧ, Барыс ПРАКОПЧЫК, Надзея ЮШКЕВІЧ, Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ГАЛАСУЮЦЬ ВАЙСКОЎЦЫ

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

У першы дзень датэрміновага галасавання за кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі 6-га склікання на ўчастку Уручскай выбарчай акругі №109 было нешматлюдна. Нягледзячы на тое, што ўчастак для галасавання размешчаны на тэрыторыі вайсковай часці (120-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады), адным з першых выбаршчыкаў стаў мясцовы жыхар акругі.

Паступова ў чаргу за бюлетэнямі падышлі ваеннаслужачыя. Многія з іх імкнуліся аператыўна зрабіць свой выбар таму, што неўзабаве адбудуць на баявую падрыхтоўку. Тых вайскоўцаў, якіх датэрміновае галасаванне і дзень выбараў застануць на палігоне, таксама будуць мець магчымасць прагаласаваць. У нядзелю, у асноўны дзень падзеі, да іх прыедуць прадстаўнікі выбарчай камісіі і арганізуюць галасаванне на месцах.

— Мы не прымушаем людзей аддаваць свой голас, але разам з тым ствараем умовы ўсім знаходзіцца ў роўных магчымасцях, — адзначае намеснік камандзіра 120-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады па ідэалагічнай рабоце — начальнік аддзялення ідэалагічнай работы, старшыня камісіі Уручскай выбарчай акругі №109 гвардыі падпалкоўнік Сяргей КОРНЕЎ. — Усяго на нашым участку галасуе каля 3 тысяч чалавек. Амаль тысяча з іх — ваеннаслужачыя, астатніх выбаршчыкаў прадстаўляе цывільнае насельніцтва, якое жыве ў дамах, якія тэрытарыяльна адносяцца да нашага ўчастка.

За ходам галасавання сочыць 10 назіральнікаў, сярод якіх — прадстаўнікі воінскіх калектываў, ветэранскай арганізацыі раёна, Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, прафсаюзнай арганізацыі. Выбарчая камісія акругі складае 13 чалавек.

Сярод іх — і прадстаўнікі вайсковай часці, у тым ліку салдаты тэрміновай службы. Як расказаў адзін з членаў выбарчай камісіі малодшы сяржант Віктар ТАРАСЕВІЧ, перш чым трапіць у камісію, юнакі прайшлі ўнутранае галасаванне. «Да гэтай важнай падзеі мы рыхтаваліся падчас спецыяльных заняткаў, — расказвае салдат тэрміновай службы. — Наш асноўны абавязак — забяспечыць кожнага чалавека магчымасцю прагаласаваць на нашым участку і сачыць за тым, каб не было ніякіх парушэнняў. Што тычыцца вайскоўцаў, яны актыўна галасуюць: добра разумеюць, што робяць адказны крок у жыцці, які вырашыць будучыню краіны».

Пазнаёміцца з кандыдатамі ў дэпутаты або яшчэ раз вырашыць, за каго зрабіць выбар, можна дзякуючы інфармацыйнаму стэнду, размешчанаму ў памяшканні для галасавання. Большасць вайскоўцаў ужо ведае, за каго аддасць свой голас: азнаёміцца з інфармацыяй аб кандыдатах яны змаглі ў сваім вайсковым падраздзяленні, дзе арганізаваны куткі выбаршчыка, прадстаўлены асноўныя заканадаўчыя акты. Таксама на тэрыторыі злучэння былі арганізаваны сустрэчы з кандыдатамі ў дэпутаты. Ды і ў горадзе, наўрад ці ў агітацыйны час можна было абмінуць шматлікія пікеты і стэнды з інфармацыяй.

Вераніка КАНЮТА. *kanyuta@zviazda.by*

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 20 сентября 2016 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Минскремстрой»

Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества)	«Административно-хозяйственное здание Литер А 1/к» общей площадью 612,4 кв. м (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-8620; назначение – здание административно-хозяйственное), теплосети (инв. №300992), электросети (инв. №300994), водопроводные сети (инв. №300995), канализационные сети (инв. №300993), асфальтовая площадка (инв. №200997)
Местонахождение предмета торгов	г. Минск, ул. Гикало, д. 22Б
Сведения о земельном участке	Кадастровый номер 500000000008000726, площадь – 0,1002 га; назначение – эксплуатация и обслуживание административно-производственного здания
Сведения о продавце	ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220030, г. Минск, телефон (017) 226-41-15
Сведения об организаторе торгов	Государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, телефон (017) 327-05-62
Начальная цена предмета торгов с учетом НДС	1 125 591,20 белорусских рублей (11 255 912 000 белорусских рублей образца 2000 года)
Условие торгов	Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию документа, подтверждающего внесение задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 по г.Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в торгах.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **20 сентября 2016 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 07.09.2016 по 16.09.2016 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017)327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017)200-99-78, (029)350-46-23 (ОАО «Минскремстрой»).

Утерянное свидетельство ООО «АльфаМонтажстройинвест» (УНП 191378837) **считать недействительным.**

Утерянные квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии КС 3589715, КС 3589714 страховой компании «Промтрансинвест» **считать недействительными.**

Шукалі грыбнікоў

За мінулыя выхадныя ратаўнікі мусілі чатыры разы прымаць удзел у пошуках аматараў «ціхага палявання». Увечары 3 верасня віцебскім ратаўнікам дзяжурны РАУС паведаміў, што каля вёскі Астроўскія Віцебскага раёна згубіўся мужчына 1937 года нараджэння. Да ночы яго пошукі плёну не далі, і толькі каля сямі гадзін раніцы грыбнік самастойна выйшаў да людзей. У Лагойскім раёне пра пенсіянера, што заблудзіў, таксама стала вядома ад праваахоўнікаў: мінчанін выправіўся па грыбы ў лес каля аграгарадка Гасцілавічы яшчэ раніцай і згубіўся. Выйсці з угоддзяў яму дапамог гук сірэны аўтамабіля МНС. У меддапамозе мужчына патрэбы не меў. А ў Віцебскай вобласці пакуль яшчэ працягваюцца пошукі дзвюх жанчын, якія 4 верасня выправіліся па грыбы каля вёскі Бараўляны. Іх гукалі да трох гадзін ночы, аднак плёну аперацыя пакуль не дала...

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■ За падзеяй

Пад зоркай першадрукара

II міжнародны форум «Скарынаўскія чытанні: кніга як феномен культуры, мастацтва, тэхналогіі» праходзіць у сталіцы

Каб абмеркаваць актуальныя пытанні кнігавыдання, кнігагандлю, падзяліцца вынікамі даследаванняў у галіне вывучэння кніжнай культуры і літаратуры, у Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце сабраліся вядучыя спецыялісты галіны з Беларусі і Украіны. Адметна, што ўдзел у форуме поруч з вядомымі навукоўцамі бяруць таксама вучні, настаўнікі, таму можам быць упэўненымі, што айчынная кніжная справа ў будучыні не застанецца ў забыцці.

БДТУ невыпадкова стаў установай, якая вось ужо другі год запар ладзіць «Скарынаўскія чытанні». Гэты ўніверсітэт — адзін з вядучых цэнтраў падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне рэдакцыйна-выдавецкіх і паліграфічных тэхналогій у СНД. Яго паважаюць, на навуковыя здабыткі яго супрацоўнікаў арыентуюцца спецыялісты з многіх краін.

Падчас пленарнага пасяджэння **рэктар БДТУ Ігар ВОЙТАЎ** зазначыў:

— Гісторыя кнігадрукавання арганічна ўключана ў агульны культурна-гістарычны працэс. Кожная эпоха знаходзіць дакладнае адлюстраванне ў мастацтве стварэння кнігі, але і кніга ў пэўныя часы адыгрывала вядучую ролю ў фарміраванні новага стылю ў мастацтве. Развіццё кнігавыдання, клопат пра яго стан мае не толькі маральны сэнс, але і вялікае практычнае значэнне. Спадзяюся, што форум «Скарынаўскія чытанні», які ўжо становіцца штогадовым, зробіць свой важкі ўнёсак у пошук адказаў на пытанні пра шляхі развіцця сучаснай кнігі як феномена культуры, мастацтва і тэхналогіі.

Пра важнасць правядзення «Скарынаўскіх чытанняў» у сваім выступленні гаварыў і **першы намеснік міністра інфармацыі Ігар ЛУЦКІ**:

— Кнігавыданне — адзін з прыярытэтных напрамкаў нашай дзяржавы ў галіне культуры. Леташнія «Скарынаўскія чытанні» сталі прыкметнай з'явай у навуковым і культурным жыцці не толькі нашай сталіцы, але і далёка за яе межамі. Значнасць падобных мерапрыемстваў вызначаецца многімі фактарамі. Кніга — сапраўдны феномен у жыцці грамадства і кожнага чалавека. І вельмі важна, што падчас форуму закранаюцца розныя аспекты галіны, мы абмяркоўваем не толькі пытанні, звязаныя з мовай твораў, аўтарскім стылем, афармленнем, тыражамі, але і маркетынг, сістэму распаўсюджвання, сучасныя тэхналогіі і вытворчую базу кнігавыдання.

І сапраўды, падчас форуму яго ўдзельнікамі закранаюцца самыя разнастайныя пытанні, звязаныя з кнігай. Гэта і рукапісныя аўтарскія кнігі, і дзіцячая літаратура, і творчасць

■ Фестывалім

ЁН ЁСЦЬ У БРЭСЦЕ!

У пятніцу адкрые заслону XXI міжнародны тэатральны фестываль «Белая вежа»

Колькі разоў яму прадказвалі то хуткае, то паступовае згасанне, а ён жыве! Насуперак усім скептычным прагнозам. І ўжо цяжка ўявіць брэсцкую восень без свята тэатральнага мастацтва, без яркага шэсця ў дзень адкрыцця, без цікавых вулічных спектакляў, без аншлагавых пастановак у вялікай зале тэатра.

Можна сцвярджаць, што за два дзесяцігоддзі фестываль выхаваў свайго гледача. Гэта адзначалі шматлікія тэатразнаўцы з многіх краін свету. Ды і без іх кампетэнтнага вердыкту можна зрабіць такую выснову, калі пахадзіць па фае тэатра перад спектаклем. Людзі сустракаюцца, вітаюцца, нібы сваякі, якія не бачыліся год. Так і ёсць, многія ўжо лічаць сябе знаёмымі, бо бачацца менавіта падчас фэстывалю. Неяк у прыватнай гутарцы кіраўнік брэсцкага тэатра і арганізатар фэсту сказаў, што на фестывальныя спектаклі не ходзяць багатыя людзі, а ходзіць гарадская інтэлігенцыя — настаўнікі, урачы, службоўцы. Прыходзіць шмат пенсіянераў, якім, каб трапіць на пастаноўку прыезджых артыстаў, даводзіцца адкладваць грошы некалькі месяцаў. Але ж у невялікім 300-тысячным Брэсце па-ранейшаму білеты разыходзяцца, людзі ідуць на спектаклі, а значыць, фестываль запатрабаваны. І нават цяпер, калі крызіс падкасіў пакупніцкія здольнасці многіх, за два тыдні да фэсту было прададзена каля 70 працэнтаў квіткоў на спектаклі.

Пра гэта паведаміла **намеснік генеральнага дырэктара Брэсцкага тэатра драмы Ларыса НАВІЦКАЯ.** Можна дадаць, што гэтым разам у продаж было выпушчана больш за дзевяць тысяч білетаў.

Класіка ніколі не падводзіла брэсцкі фэстываль. Яна і цяпер карыстаецца папулярнасцю. Так, на адкрыццё — камедыю Уільяма Шэкспіра «Дванаццатая ноч», якую дае Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М. Горкага, білеты ўжо раскуплены. Фактычна не засталося білетаў на пастаноўкі «Дзядзька Ваня» Наўгародскага акадэмічнага тэатра імя Ф. М. Дастаеўскага, «Ноч перад Раством» Чарнігаўскага абласнога акадэмічнага ўкраінскага музычна-драматычнага тэатра імя Т. Шаўчэнкі, «Язычнікі» нашых горкаўцаў і іншыя. Хутка раскупілі білеты і на спектаклі, запланаваныя для паказу ў малой зале. Маецца на ўвазе «Ксенія» тэатра з Польшчы «Чэрава», «Рэвізор» у пастаноўцы трупы з Грузіі. Дарэчы, у папярэднія гады работы грузінскіх тэатраў мелі ў нас сапраўдны поспех.

Кошт квіткоў цяпер можна назваць дэмакратычным. У сярэднім ён блізкі да 10 новых рублёў, адзін з самых дарагіх білетаў на «Дванаццатую ноч» каштуе 25 рублёў. І пры гэтых зусім не высокіх цэнах фестываль зарабляе крыху больш за 70 працэнтаў свайго бюджэту. Астатняе дабаўляюць спонсары і абласная казна.

Арганізатары «Белай вежы» на прэс-канферэнцыі з нагоды не без шкадавання адзначалі, што часам незаслужана падазрона глядач ставіцца да розных эксперыментальных пастановак. А тэатральны форум для таго і праводзіцца, каб адкрываць новыя напрамкі, новыя формы, нават новыя павевы развіцця мастацтва. Таму здараецца, што самабытныя, надзвычай цікавыя тэатры, якія на «Вежы» рэдкія госці, а то і наогул прыехалі ўпершыню, застаюцца па-за ўвагай. Так і цяпер — не сказаць, каб актыўна раскупляліся білеты на пастаноўку берлінскага тэатра «Руская сцэна», які называецца «Рудольф Нурыеў. 48 гадзін» пра славутага танцора, спектакль казахскага тэатра «А ў пустыні мёртвая цішыня» і «Мы абавязкова сустрэнемся» Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра імя А. С. Пушкіна з Ашхабада, некаторыя работы артыстаў з Бухарэста і Кракава. Не разабралі ў першыя дні і квіткі на мюзікл па Дастаеўскім «Раскольнікаў» Інстытута сучасных мастацтваў з Масквы...

Але ж трэба зразумець і гледача, які не спяшаецца рублём галасаваць за тэатральны эксперымент. Здарылася, падманвалі чаканні і вядомыя калектывы, і навічкі, калі падсоўвалі прадукт накшталт серыяльнай дзеі «на патрэбу» альбо проста сумныя маналогі. Таму варта дараваць гледачу пэўную насцярожанасць і спадзявацца на тое, што, паводле слова Аляксандра Козака, чалавек, які прыйдзе на фэст, зробіць адкрыццё нават там, дзе яго зусім не чакаў.

Такім адкрыццём, на думку арткамітэта фестывалю, можа стаць эксперыментальны спектакль Дзяржаўнага акадэмічнага рускага тэатра драмы імя М. Горкага па п'есе Ганны Яблонскай «Язычнікі». Упершыню на «Вежу» прыедзе трупа з Туркменістана. Аказалася, што гэтая дзяржава будзе наогул першы раз прадстаўляць сваё тэатральнае мастацтва ў Беларусі. З Казахстана прыедуць ажно два тэатры. Калектыў «Жастар театры» акімата горада Астаны колькасцю больш за паўсотні акцёраў прадставіць традыцыйна нацыянальную п'есу па творы Чынгіза Айтматава «А ў пустыні мёртвая цішыня». Цікавай абяцае стаць танцавальная пастаноўка «Па-дэ-дэ: ад вальса да хіп-хопа» ліёнскай тэатральнай кампаніі De Facto. Інтрыгуе заяўка ў афішы на ўдзел вядомага англійскага драматурга і акцёра Піпа Утана з лірычнай монадрамай «Чаплін». У праграме таксама пазначаныя тэатры формы, гульня ў гатычны трылер, неверагодную прыпавесць, рок-оперу, мюзікл, вулічныя прадстаўленні.

Не будзе гэтым разам лялечнай праграмы. Будаўніцтва новага лялечнага тэатра зацягнулася, таму адпаведныя спектаклі прымаць няма дзе. А раней пастаноўкі лялечнікаў нярэдка выклікалі не проста апладысменты, станавіліся крыніцай захаплення, забіралі гран-пры... Цяпер, дарэчы, гран-пры прысуджаць не будуць, як і вызначаць тройку прызёраў. Журы на фэсце не прадугледжана. Найлепшыя работы назавуць экспертныя радой, якія ўтвараюць з крытыкаў і прадстаўнікоў грамадскасці. Акрамя айчынных тэатразнаўцаў, на «Белую вежу» далі згоду прыехаць крытыкі з Эстоніі, Польшчы, Літвы, Украіны, Расіі. Як і раней, пасля кожнага спектакля адбудзецца яго абмеркаванне — размова стваральнікаў, экспертаў, гледачоў, журналістаў. Паводле слоў Аляксандра Козака, гэтую «фішку» нашага тэатральнага форуму перанялі некаторыя іншыя фестывалі. У брэсцкага ёсць у гэтым сэнсе і некаторыя іншыя традыцыі. Напрыклад, у начным клубе гарадскога Дома культуры можна пагутарыць з акцёрамі і тэатраламі ў нефармальнай атмасферы.

Як паказвае практыка, прыезджыя ўдзельнікі тэатральнага свята прыязна адклікаюцца пра нашу гасціннасць, добрую арганізацыю, творчую і святочную атмасферу форуму. За гэтым стаіць вялікая работа гаспадароў фестывалю. Вось і сёлета ў горад прыязджае прыкладна паўтысячы гасцей. Па традыцыі ім прапаноўваецца грунтоўная экскурсійная праграма. Для таго, каб прадстаўнікі розных краін адчувалі сябе камфортна, кожную групу суправаджае акцёр брэсцкага тэатра і валанцёр з ліку студэнтаў з веданнем замежнай мовы.

Застаецца дадаць, што спектаклі пройдуць на пяці пляцоўках горада. 9 верасня над будынкам нашага тэатра ўздымецца 17 сцягоў — па ліку краін свету, якія прадставяць у Брэсце 26 калектываў. А ўрачыстае закрыццё сёлета ўпершыню пройдзе не ў зале, а на плошчы Леніна. 16 верасня ў 20.30 «Тэатр новага фронту» з Прагі пакажа спектакль «CAUSA FATALIS».

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by

■ Пытальнік

«ВЫКАЖЫЦЕ СВАЕ КАНСТРУКТЫЎНЫЯ ЗАЎВАГІ НАКОНТ КАНТЭЙНЕРАЎ ДЛЯ АДХОДАЎ ПІСЬМОВА»

У нас у мікрараёне даўно ўстанавілі смеццевыя кантэйнеры для збору адходаў пластыку, паперы, шкла. Раней яны былі адкрытымі, у іх зручна было скідваць адпаведнае смецце. А новыя закрыты масіўнымі накрыўкамі, у якіх маюцца невялікія адтуліны, куды, па задуме канструктараў, людзі павінны прапіхваць адходы. Але я, як і большая частка гараджан, раблю так: дома маецца мяшок для збору пластыку і мяшок — для паперы. Калі яны запаўняюцца, я іх выкідваю. Аднак, паколькі я чалавек беражлівы, а адходы гэтыя чыстыя, то я вытрасаю змесціва ў кантэйнер, а мяшкі выкарыстоўваю паўторна. Запіхваць пластык ці паперу ў адтуліны ў накрыўцы цяперашніх кантэйнераў, вымаючы яго маленькімі порцыямі, наўрад ці хто будзе. А як выкінуць, калі кантэйнер закрыты? Я спрабаваў ссунуць накрыўку — у мяне атрымалася зрабіць тое сантыметраў на 20, больш не змог. А калі прыйдзе да кантэйнера дзіця ці стары чалавек? Яны не здолеюць гэтага зрабіць, бо накрыўка цяжкая, ды і росту трэба быць як мінімум паўтара метра, каб дацягнуцца да ручкі. Што яны зробяць? Проста выкінуць адходы ў звычайны кантэйнер, які заўсёды адкрыты. Толькі ў адным месцы ў нашым мікрараёне я бачыў адкрытыя кантэйнеры для збору адходаў. Прашу накіраваць мой ліст іх гаспадарам, каб яны абавязалі сваіх работнікаў адчыняць кантэйнеры пры ўстаноўцы. На іх напісана «Спецкамунаўтатранс».

Уладзімір Пятровіч НАВУМЕНКАЎ, *г. Мінск*

Галоўны інжынер прадпрыемства «Спецкамунаўтатранс» Вячаслаў Дымовіч на запыт рэдакцыі коратка патлумачыў, што прадпрыемства толькі абслугоўвае памянёныя чытачом кантэйнеры для асобнага збору адходаў. Іх вырабам яны не займаюцца. Суразмоўца выказаў думку, што згаданыя кантэйнеры — прадукцыя «Жылкамплект». Галоўны інжынер ужо гэтага прадпрыемства Аляксей Чахоўскі, удакладніўшы адрас пражывання нашага заяўніка, неўзабаве пацвердзіў, што сапраўды кантэйнеры іх вытворчасці. На жаль, у яго не атрымалася звязацца з Уладзімірам Навуменкам, каб больш падрабязна ўдакладніць сутнасць прэтэнзій нашага чытача. Таму праз газету Аляксей Віктаравіч паведаміў наступнае:

— Гаворка ідзе пра так званыя еўракантэйнеры для асобнага збору адходаў. Іншымі словамі, яны выпускаюцца згодна з тымі ж параметрамі, што і ў іншых краінах Еўропы. Вырабляюцца кантэйнеры на заказ і па тых тэхнічных умовах, якія дасылае нам Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка. Калі гэта кантэйнер, напрыклад, для збору ПЭТ-бутэлек, значыць, у ім канструктыўна прадугледжана адтуліна па памеры якраз пад пластыкавую бутэльку. Таму не зусім зразумела, чаму ваш чытач не можа яе прапіхнуць.

ФІЗІЧНАЯ НАГРУЗКА. Пры актыўных занятках спортам адбываецца насычэнне клетак і тканак кіслародам, узмацняецца кровазварот, умацоўваецца сардэчная мышца. Перавагу варта аддаць хадзе, бегу, лыжным прагулкам, яздзе на веласіпедзе. Той, хто не займаецца фізкультурай і спортам, павінен пачынаць з хады. Мінімальная нагрузка — 3 разы на тыдзень па 30 хвілін. Той, хто бегае, павінен прабягаць больш за 30-40 км за тыдзень. Аэробныя нагрузкі не адмяняюць гімнастыку ў хатніх умовах.

ХАРЧАВАННЕ. Важна ўжываць дастатковую колькасць поліненасычаных тлустых кіслот і клятчаткі. А для гэтага трэба ўключыць у рацыён:

рыбу вараную або гатаваную на пары — 2-3 разы на тыдні;

авакада ў сырым выглядзе — 1-2 плады на тыдні;

льняны алей — 2 ст. л. на дзень;

арэхі — 6-8 штук на дзень;

грэцкую і аўсяную кашы, неачышчаны рыс.

Акрамя таго, гарбуз, часнок, капусту брокалі, суніцы, гранаты.

АНТЫСТРЭС. Стрэс наносіць магутны ўдар па сасудах. Сардэчна-сасудзістая сістэма наўпрост звязана з мозгам і гарманальнай сферай. Перажываем негатыўныя эмоцыі — страх, гнеў, раздражненне — значыць, сэрца будзе пакутаваць. Для прафілактыкі спазму сасудаў неабходна як мага часцей бываць на прыродзе, вучыцца спакойна ўспрымаць дробныя непрыемнасці, пакідаць думкі пра работу, прыходзячы дадому, слухаць расслабляльную музыку, шукаць усё, што дорыць пазітыўныя эмоцыі.

ШКОДНЫЯ ЗВЫЧКІ. Здаровыя сасуды не могуць быць у таго, хто курыць. Нікацін іх спазміруе і пашкоджвае сасудзістую сценку, у выніку чаго там лягчэй адкладаюцца атэрасклератычныя бляшкі. А празмернае ўжыванне алкаголю дапамагае зліпацца клеткам крыві, што павялічвае рызыку тромбаў, павышае нагрузку на сэрца. Алкаголь таксама спрыяе ўтварэнню бляшак. Таму максімальна скараціце ўжыванне алкаголю, а калі і ўжываеце, напрыклад, падчас банкета, то не забывайце піць паболей вады і есці больш свежай агародніны. Да шкодных звычак у гэтым выпадку можна аднесці і доўгае сядзенне перад тэлевізарам або за камп'ютарам.

• **Практычная парада**

МЕРАЕМ ЦІСК

Кожны чалавек павінен ведаць узровень свайго артэрыяльнага ціску. Высокія лічбы нельга збіваць лекамі, якія не прапісваў урач, а параіла суседка.

«Мераць ціск можна ў кабінеце даўрачэбнага прыёму, падчас наведвання ўрачоў розных спецыяльнасцяў і дома, — нагадвае **ўрач аддзялення дзённага знаходжання 2-й цэнтральнай раённай паліклінікі г. Мінска Алена ЛАПСАР.** — Пажадана некалькі разоў за суткі — раніцай, днём і ўвечары, у адзін і той жа час, на адной руцэ. Калі памералі на абедзвюх і лічбы аказаліся рознымі, мерайце далей на той, дзе ён вышэйшы».

У норме ціск не павінен перавышаць 140/90 мм рт. сл. Пры павышаных лічбах абавязкова звярніцеся да ўрача-тэрапеўта.

Перад вымярэннем нельга падвяргацца фізічнай нагрузцы; прыём ежы, уздзеянне холаду, курэнне трэба выдаліць; пажадана спакойна пасядзець цягам 5-10 хвілін.

Вызваліце руку ад адзення. Не закасвайце рукаў, бо гэта можа сціснуць руку і вымярэнне будзе недасканалым. Надзеньце манжэту на 2-3 см вышэй за ўзровень локцевага згібу, каб уваход трубкі размяшчаўся над ямкай. Зацягніце манжэту, якая павінна знаходзіцца на ўзроўні сэрца, шчыльна, але не туга. Расслабце мышцы рукі.

ЗРАБІЦЕ ЛІПІДАГРАМУ

Для перасоўвання па арганізме халестэрыну неабходны спецыяльны «транспарт» — ліпапратэіны. Яны бываюць высокай шчыльнасці, нізкай і вельмі нізкай. Халестэрын, які знаходзіцца ў саставе двух апошніх відаў, лічыцца «дрэнным» — ён утварае бляшкі на сценках сасудаў. І наадварот, ліпапратэіны высокай шчыльнасці «сочаць» за чысцінёй сасудаў і перашкаджаюць утварэнню бляшак. Каэфіцыент (індэкс) атэрагеннасці паказвае суадносіны «дрэннага» халестэрыну да «добрага». Яго значэнне з'яўляецца важным паказчыкам абмену халестэрыну ў арганізме.

У НОРМЕ:

Агульны халестэрын — менш за 5,0 ммоль/л.

Халестэрын ліпапратэінаў нізкай шчыльнасці — менш за 3,0 ммоль/л.

Халестэрын ліпапратэінаў высокай шчыльнасці — больш за 1,0 (муж.), больш за 1,2 (жан.).

Каэфіцыент атэрагеннасці — 3-3,5 (чым вышэйшы гэты паказчык, напрыклад звыш 5, тым вышэйшая рызыка развіцця атэрасклерозу, сасудзістых захворванняў сэрца, галаўнога мозга, канечнасцяў, нырак)

■

■ Асаблівасці захворвання

Сіндром чырвонага вока

Пачырваненне вачэй з'яўляецца адной з самых распаўсюджаных прычын звароту да афтальмолага, праўда, часам досыць позняга.

Комплекс захворванняў з такой праявай атрымаў назву «сіндрому чырвонага вока». Прычын у такога сіндрому мноства, гэта можа быць звязана з траўматычным пашкоджаннем вока, вострым прыступам глаўкомы, язвай рагавіцы — і гэта патрабуе неадкладнага хірургічнага лячэння. Калі ж гэта ўвеіт, ірыдацыкліт, ірыт, неабходна грунтоўна абследавацца. А найбольш распаўсюджанай прычынай чырвоных вачэй з'яўляюцца разнастайныя кан'юнктывіты — бактэрыяльныя, вірусныя, грыбковыя, хламідыйныя, алергічныя... Кожны від мае свае асаблівасці, патрабуе сваёй дыягностыкі для выбару індывідуальнай схемы лячэння, бо няправільна прызначаныя прэпараты могуць пагоршыць стан і прывесці да сур'ёзных ускладненняў. Самае проста, што можа быць, — «сухое вока», звязанае з парушэннем утварэння слязы. Прызначэнне прэпаратаў штучнай слязы можа поўнасцю пазбавіць непрыемных сімптомаў.

Акрамя ўласна пачырванення, могуць быць і іншыя непрыемныя сімптомы, тыя ж выдзяленні. Пры вострым прыступе глаўкомы моцны боль будзе распаўсюджвацца на палову галавы; акрамя таго, будуць млосць, памутненне рагавіцы, расшыраная зрэнка, якая не рэагуе на святло. Пры кератыце, акрамя ўзнікнення болю, пашыраюцца сасуды паверхні вочнага яблыка, узнікае адчуванне іншароднага цела, зніжаецца зрок. Сверб можа сведчыць як пра алергію, так і пра адэнавірусны кан'юнктывіт. Праўда, пры алергіі сверб павінен спалучацца з ацёкам павек і кан'юнктывы.

— Адна з асаблівасцяў нашых пацыентаў — любоў да самалячэння і прызначэння самім сабе прэпаратаў, што прыводзіць да непажаданых наступстваў і прымушае звярнуцца ў медустанову ўжо ў запушчанай сітуацыі, — адзначае **ўрач-афтальмолаг 3-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі г. Мінска Надзея ХАРОШКА.** — Таксама нярэдка даводзіцца чуць, што тыя ці іншыя кроплі парэкамендавалі ў аптэцы, але ж ні правізар, ні фармацэўт не валодаюць поўнай інфармацыяй аб пацыенце і ў сваіх рэкамендацыях арыентуюцца толькі на словы пацыента. Часам толькі прымяненне лабараторнай дыягностыкі дазваляе ўстанавіць прычыну захворвання і выбраць правільнае лячэнне

■

■ Асабістая гігіена

ВАЖКАЯ ПРЫЧЫНА ЧЫСЦІЦЬ ЗУБЫ

Стан зубоў на 90 працэнтаў залежыць ад таго, колькі ўвагі мы ўдзяляем догляду за імі.

Даследаванні, прысвечаныя здароўю ротавай поласці, паказалі:

46 секундаў у сярэднім трацяць пацыенты на чыстку зубоў (замест рэкамендаваных 2 хвілін);

72 працэнты насельніцтва мае бачны зубны налёт;

73 працэнта — адкладанні зубнога каменю.

— Догляд ротавай поласці неабходны для прафілактыкі карыесу, пазбаўлення непрыемнага паху і папярэджвання ранняй страты зубоў, — кажа **ўрач стаматолаг-тэрапеўт 9-й стаматалагічнай паліклінікі г. Мінска Тамара КАНАШЭЎСКАЯ.** — Калі гігіенічныя мерапрыемствы праводзяцца нерэгулярна або недастаткова эфектыўна, на зубах застаецца налёт, а ў прамежках паміж зубамі збіраюцца рэшткі ежы, якая гніе. Гэта і выгляд надае адпаведны, і дыханне робіць нясвежым.

Налёт, які існуе працягла, мінералізуецца і ператвараецца ў зубны камень. У выніку непрыемны пах не выдаляецца нават пасля чысткі зубоў, дзясны запаляюцца і нярэдка крывавяць. Часцей за ўсё камень утвараецца ў міжзубных прамежках і на мяжы дзясны. Гэта спрыяе развіццю карыесу, бо пад такімі адкладаннямі мяняецца зубная эмаль. Дый бактэрыі ахвотна размнажаюцца ў такім спажыўным асяроддзі. Падчас размнажэння бактэрый узнікае ачаг хранічнай інфекцыі. Гэта ўплывае на работу імуннай сістэмы і часам нават прыводзіць да інфекцыйна-запаленчых захворванняў у розных органах.

Вучоныя налічылі больш за 60 захворванняў, прычынай узнікнення якіх з'яўляюцца мікробы ротавай поласці: сардэчна-сасудзістыя, рэўматызм, захворванні органаў стрававання, хваробы нырак, скураныя, эндакрынныя, нават нервовыя расстройствы.

Так што гігіена зубоў — не проста знешняя прывабнасць

■

І ніткі не забудзьце!

Цалкам ачысціць зубы з дапамогай шчоткі немагчыма. Для гэтага выкарыстоўваюць спецыяльныя ніткі — флосы, выраблены са штучнага валакна. Ніткі могуць быць круглымі, плоскімі, рознага сячэння і формы.

Дзецям не варта карыстацца флосамі самастойна.

Ніткі даўжынёй 35-40 см накручваюць вакол фалангаў пальцаў, фіксуюць у міжзубным прамежку і выдаляюць зубныя адкладанні (дастаткова 6-7 рухаў для кожнага зуба) зігзагападобнымі рухамі ўгору. Каб не траўмаваць мяккія тканкі, нітку пастаянна трэба прыціскаць да зуба. Адпрацаваны ўчастак ніткі накручваецца на палец.

Зубная сацінавая нітка з мятным смакам лёгка ўводзіцца ў прамежкі паміж зубамі і валодае добрай трываласцю з-за двайнога слою.

Зубная нітка, якая расцягваецца, вельмі зручная для карыстання, бо падчас расцягвання становіцца тонкай. Валодае мятным смакам, мае каляровую разметку, якая пазначае рабочую даўжыню ў 45 см, неабходную для зручнай і эфектыўнай чысткі.

Васкаваная нітка таксама спрыяе лепшаму слізганню па паверхні за кошт пакрыцця воскам. Ёсць яшчэ суперфлос — высокатэкстураванае нейлонавае валакно ў выглядзе сумесі нейлону і поліўрэтану.

Тэйп — зубная стужка, якая фактычна нічым не адрозніваецца ад флоса, акрамя таго, што яна ў тры разы шырэйшая.

Фласеты — флосатрымальнікі, робяцца з аналагічнай пластмасы, што і зубныя шчоткі. Флосы, якія там выкарыстоўваюцца, ідэнтычныя ўласна флосам.

■ Доктар адкажа

ВАДА З ЛІМОНАМ — АД ПАДАГРЫ

«Падкажыце, калі ласка, што рабіць і чаго не рабіць пры абвастрэнні падагры?

Юрый Мікалаевіч,
Гродзенская вобласць».

Тлумачыць **участковы тэрапеўт 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Настасся ЖЫДЗІС:**

— Боль у суставе, як правіла, пачынаецца ноччу і становіцца невыносным. Удзень можа быць нейкае паляпшэнне, але не варта думаць, што ўсё прайшло. Такія вострыя сімптомы могуць мучыць каля тыдня. Нават пры вытрымліванні рэкамендацый востры прыступ не пройдзе імгненна. Але гэта дазволіць скараціць час яго працягласці.

Галоўным чынам трэба вытрымліваць строгі пасцельны рэжым. Хворую канечнасць лепей трымаць на ўзвышэнні — падкласці пад яе падушку. Калі боль нясцерпны, можна прыкласці лёд, затым кампрэс з дымексідам. Прыём ежы варта істотна абмежаваць — можна ўжываць вадкія кашы і булёны з агародніны. Пры гэтым піць як мага больш шчолачных напояў, напрыклад адвар з аўса, кісель, малако, мінеральную ваду або проста ваду з дабаўленнем лімоннага соку. Лімонны сок растварае адкладанні мачавой кіслаты пры рэўматызме і падагры.

Часцей за ўсё падагра з'яўляецца ў тых месцах, дзе суставу была нанесена траўма. Таму беражыце такія месцы. Не насіце вузкі і нязручны абутак. У харчаванні аддавайце перавагу цэльным злакам, яйкам, агародніне, садавіне, нятлустым малочным прадуктам. Абмяжоўвайце мяса, рыбу, ікру, грыбы, бабовыя. Не ўжывайце наогул вэнджанага, марынадаў, анчоўсаў, квяцістай капусты, спаржы, шчаўя, шакаладу, алкаголю, асабліва піва. Наогул, курэнне і алкаголь перашкаджаюць вывядзенню мачавой кіслаты з арганізма, і яе крышталі актыўней адкладваюцца ў суставах. З вывядзенням непатрэбных пурынаў выдатна спраўляюцца шчолачныя мінеральныя воды.

Каб звесці рызыку ўзнікнення новых прыступаў да мінімуму...

...перыядычна фіксуйце сустаў у прыўзнятым становішчы і прыкладвайце лёд на 15—30 хвілін 2-3 разы ў дзень, пакуль боль не сцішыцца;

...не злоўжывайце аспірынам, які выклікае скачкі ўзроўню мачавой кіслаты ў крыві;

...штодня па паўгадзіны прысвячайце фізкультуры, раніцай рабіце зарадку;

..не ўжывайце алкаголю, газіраваных напояў з бензанатам натрыю і парашковых сокаў з фруктозай;

...ужывайце не больш за 120 г жывёльнага бялку ў дзень, пазбягайце субпрадуктаў і тлустых каўбас.

Таксама неабходна рэгулярна праходзіць медыцынскае абследаванне

■

■ Рызыкоўныя паводзіны

ДАВЕР НЕ АБАРАНЯЕ!

Ні знешні выгляд, ні адукацыя, ні сацыяльны статус не могуць сведчыць аб наяўнасці ці адсутнасці венерычных захворванняў

Інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам, больш за тры дзясяткі. Адны з іх выклікаюць бактэрыі (сіфіліс, ганарэя), у іншых вінаваты вірусы (герпес, кандыломы, ВІЧ-інфекцыя), прасцейшыя (трыхаманіяз), грыбы (кандыдоз). Пры палавых кантактах перадаюцца яшчэ кароста і вошы. Штосьці з гэтага спіса дакладна было вядома яшчэ за некалькі стагоддзяў да нашай эры, аб чым сведчаць старажытныя рукапісы Егіпта, Грэцыі, Індыі, Кітая... Загадчык амбулаторнага дэрматавенералагічнага аддзялення Мінскага гарадскога скурна-венералагічнага дыспансера Уладзімір ЯРОМІЧ нагадвае, як важна дакладна ведаць, што і ты сам, і твой палавы партнёр здаровыя.

— Асаблівасць інтымнага жыцця сёння — распаўсюджванне практыкі аральнага і анальнага сексу. У першым выпадку, як правіла, грэбуюць прэзерватывамі і забываюцца аб тым, што большасць палавых інфекцый перадаюцца пры любых формах сексуальных адносін. Такім чынам можна заразіцца і ганарэяй, і герпесам, і г.д. А пры анальным сексе без прэзерватыва нярэдка ўзнікае запаленне мочапалавых шляхоў, напрыклад, звязаны з кішэчнай палачкай урэтрыт, які дрэнна паддаецца лячэнню.

— Ці можна тут казаць пра самавылечванне?

— Такога не адбываецца. А знікненне некаторых сімптомаў тлумачыцца пераходам захворвання ў схаваную, хранічную форму. Таму, чым раней пастаўлены дыягназ і пачата лячэнне, тым больш шанцаў вылечыцца і не атрымаць ускладненняў — бясплоднасці ў мужчын і жанчын, вострых станаў, якія патрабуюць хірургічнага ўмяшання, магчымасці заражэння плода падчас цяжарнасці, нараджэння хворага дзіцяці і нават гібелі, як у выпадку з ВІЧ і гепатытамі.

— Як зразумець, што з арганізмам адбываецца штосьці не тое і звязана гэта менавіта з палавым кантактам?

— Насцярожыць павінны любыя адхіленні ад нормы — ад пачырванення скуры да мікратрэшчын, свербу, смылення падчас мочаспускання або палавога кантакту. Усё гэта пры розных інфекцыях можа праяўляцца ў розны час пасля заражэння. Адны інфекцыі могуць заявіць аб сабе праз суткі пасля кантакту, а для іншых спатрэбяцца некалькі месяцаў. Самае непрыемнае, што многія з іх могуць наогул ніяк не праяўляцца, а таму носьбіт інфекцыі будзе ненаўмысна заражаць іншых партнёраў.

— І як зразумець, што будзем лячыць?

— Без спецыяльных метадаў даследавання мы не адрознім ганакокавы працэс ад хламідыйнага. Праводзіць лабараторнае абследаванне на палавыя інфекцыі неабходна пры з'яўленні першых прыкмет дыскамфорту ў палавых органах. І лепш абследавацца адразу на ўсе інфекцыі, якія дыягнастуюцца сёння, бо пры сучаснай эпідсітуацыі верагоднасць таго, што гэта будзе толькі адна інфекцыя, не большая за 25—30 працэнтаў.

Не варта прымаць перад здачай аналізаў ніякіх лекавых прэпаратаў. Нават адна таблетка антыбіётыку можа цалкам змяніць клінічныя праявы інфекцыі, зменшыць верагоднасць выяўлення ўзбуджальніка. Прычым абследаваць трэба ўсіх сексуальных партнёраў.

— Якой можа быць шкода ад самастойнага лячэння?

— Бескантрольнае прымяненне антыбіётыкаў небяспечнае, гэта не сакрэт. Акрамя таго, не ўсе інфекцыі імі лечацца — антыбіётыкі змагаюцца з бактэрыямі, але ад іх няма карысці пры вірусных захворваннях. Пад уздзеяннем антыбіётыкаў могуць слабець і ахоўныя сілы арганізма, закліканыя змагацца з вірусамі. Няправільна падабраны прэпарат і схема лячэння здольныя часам знізіць актыўнасць бактэрый, але не вылечыць захворванне. А бактэрыі ў сваю чаргу набудуць устойлівасць да антыбіётыка, і хвароба стане хранічнай.

Усё, што трэба зрабіць пры з'яўленні першых падазрэнняў, — адразу здаць аналізы крыві і мазок. Магчыма, ужо гэта развее падазрэнні. Або давядзецца рабіць спецыяльныя аналізы на палавыя інфекцыі.

— Ці можна знізіць рызыку заражэння?

— Выпадковыя сувязі — гэта заўсёды рызыка, і ніякія знешнія прыкметы не могуць сведчыць аб наяўнасці ці адсутнасці венерычных захворванняў. Класічны сродак абароны — прэзерватыў, хоць і яго эфектыўнасць не стапрацэнтная. Вытрымлівайце правілы асабістай гігіены і патрабуйце таго ж ад партнёра. Не забывайце, што бяспечных відаў сексу не існуе наогул, а самыя небяспечныя — вагінальны і анальны без прэзерватыва

■

Матэрыялы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.
protas@zviazda.by

■ Знешні бок

КАБ СКУРА НЕ АБВІСЛА

Працяглая дыета і надта хуткая страта вагі могуць прывесці да абвісання скуры. Самыя праблемныя месцы — на жываце, твары, шыі, руках, унутраным баку сцягна. Што рабіць, каб пазбегнуць такіх непрыемнасцяў? Парады дае ўрач-дэрматавенералаг Мінскага гарадскога клінічнага скурна-венералагічнага дыспансера Ксенія КАПРАЛАВА.

Худзейце павольна, нельга скідваць больш за 0,5-1 кг за тыдзень.

Не выдаляйце з рацыёну бялкі, імкніцеся штодня ўжываць рыбу, або мяса, або птушку. Ужывайце і тлушчы, але іх колькасць не павінна перавышаць 30 г у дзень.

Займайцеся спортам для падтрымання мышцаў у тонусе. Актыўныя трэніроўкі стымулююць абмен рэчываў, узмацняюць цыркуляцыю крыві і ў выніку паляпшаюць стан скуры.

Падтрымлівайце водны баланс. Для эластычнасці скуры важна выпіваць да 2 л вады штодня.

Добра ўмацоўвае скуру кантрасны душ. Чаргуйце гарачую і халодную ваду. Масіруйце праблемныя месцы мачалкай.

1-2 разы на тыдні прымайце ванны з марской соллю.

Не забывайце пра пілінгі і скрабы, якія стымулююць рост новага эпідэрмісу. Карыстайцеся і падцягвальнымі ласьёнамі для цела.

Прымайце полівітамінныя комплексы. Па магчымасці прайдзіце курс масажу

■

АРТЭФАКТ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

Лілія АНАНІЧ.

Алесь БАДАК.

Валерый КАЗАКОЎ.

Святлана АНАНЬЕВА.

Сяргей КАНДЫБОВІЧ.

Вадзім ГУСЕЎ.

Марат АХМЕДЖАНАЎ.

Юрый КАЗЛОЎ.

Інэса СЛЮНЬКОВА.

Георгій МАРЧУК.

Яронімас ЛАЎЦЮС.

Адам АХМАТУКАЕЎ.

Фота Кастуся ДРОБАВА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Удзельнікаў прывітала **міністр інфармацыі Беларусі Лілія АНАНІЧ.** Яна зазначыла:

— Спадзяюся, гэты «круглы стол» будзе садзейнічаць умацаванню міждзяржаўных літаратурных сувязяў і стане доказам таго, што мы непарыўна звязаныя вузамі духоўнасці. Бо кніга як адно з найбольшых дасягненняў чалавецтва робіць важкі ўнёсак у міжнароднае гуманітарнае супрацоўніцтва. Словы нашага Прэзідэнта «Страцім кнігу — страцім краіну» з'яўляюцца найлепшым адлюстраваннем дзяржаўнай палітыкі ў галіне літаратуры і кнігавыдання, якая атрымлівае вялікую падтрымку. Сведчаннем гэтага з'яўляюцца візітоўкі літаратурнай прасторы: Дзень беларускага пісьменства і «круглы стол» «Сугучча», Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш і Міжнародны сімпозіум літаратараў. А таксама магчымасць на дзяржаўным узроўні аказваць падтрымку таленавітай моладзі і літаратурнай перыёдыцы. Мы штогод выдаём кнігі серыі «Школьная бібліятэка», творы беларускіх аўтараў, каб фонды бібліятэк папаўняліся класічнай і сучаснай нацыянальнай літаратурай. Пры дзяржаўнай падтрымцы ў 2017 годзе будзе адзначацца і знакавы для ўсходнеславянскай прасторы юбілей — 500-годдзе беларускага кнігадрукавання. У нашай краіне вядзецца вялікая падрыхтоўчая работа да гэтага знакавага юбілею, ужо сёлета праводзіцца шмат тэматычных мерапрыемстваў, распрацоўваецца план на будучыню. Вядома, у першую чаргу да святкавання далучаецца галіна кнігавыдання: будзе падрыхтаваны шэраг праектаў і выдадзена шмат кніг, прысвечаных спадчыне Францыска Скарыны. Адну з іх — «Францыск Скарына на мовах народаў свету» — мы палічылі важным перавыдаць напярэдадні Дня пісьменства, каб засведчыць, што спадчына нашага першадрукара агульная для ўсяго чалавецтва.

Нам трэба рабіць гістарычнае мінулае актуальным, каб новыя пакаленні трывала стаялі на гуманістычных прынцыпах, якія сцвярджаў у тым ліку і Францыск Скарына. Дзякуючы міждзяржаўным літаратурным кантактам у нашай краіне папаўняецца скарбніца нацыянальнага кнігавыдання. Беларускія выдавецтвы актыўна супрацоўнічаюць з творцамі з іншых краін, у выніку творы замежных аўтараў прыходзяць у нашы бібліятэкі і на кніжныя паліцы. Многія з гэтых выданняў сталі знакавымі праектамі ў маштабах кніжнай спадчыны Садружнасці Незалежных Дзяржаў — дастаткова прыгадаць выдатную серыю кніг «Сугучча». Важна, што дзякуючы гэтаму супрацоўніцтву і творы беларускіх літаратараў знаходзяць больш кароткі шлях да чытача ў іншых краінах.

Алесь БАДАК, пісьменнік, дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура»:

— Слова Скарыны актуальнае сёння, можа быць, як ніколі. Пяць стагоддзяў таму людзі не мелі сродкаў для такой лёгкай, як сучасная, камунікацыі, таму з'яўленне беларускага кнігадрукавання было велізарным крокам наперад, такім жа подзвігам у гэтым кантэксце з'яўляецца перапісванне кніг Еўфрасінняй Полацкай. Сёння нам важна ўспамінаць гэта і вучыцца ў вялікіх папярэднікаў, таму што кніга страчвае святасць, якую мела ў той час. Яе параўнальна лёгка выдаць і прадаць, але і забыць таксама. Калі б мы нават не ідэнтыфікавалі аўтара, маглі б па некалькіх радках вызначыць, што Скарына — беларус. А ведаеце, у чым унікальнасць беларускай літаратуры? Тут няма кніг бульварнага кшталту. Такі менталітэт: калі мы пачынаем пісаць прыгодніцкую літаратуру ці дэтэктывы, з'яўляецца Караткевіч; пішам гераіка-патрыятычную літаратуру — з'яўляецца Быкаў. Усё ідзе ад Скарыны. Таксама мы павінны памятаць, што ён быў перакладчыкам і пачаў справу, якой мы з вамі сёння займаемся і якую прапагандуем.

Юрый КАЗЛОЎ, празаік, галоўны рэдактар часопіса «Роман-газета», Масква:

— У скарынаўскай асветніцкай дзейнасці былі дзве галоўныя ідэі — сцвярджэнне высокіх хрысціянскіх ідэалаў і барацьба за кнігу і культуру. Я толькі што вярнуўся з Палесціны, дзе ўдзельнічаў у культурным форуме. Я заўважыў, што падчас паездкі да Гроба Гасподняга члены дэлегацыі з Францыі, Вялікабрытаніі, Італіі ці Іспаніі рабілі фота, глядзелі па баках і выказвалі поўную абыякавасць да хрысціянскіх каштоўнасцяў. У той жа час мяне парадавала, што прадстаўнікі славянскіх народаў (сербы, беларусы, украінцы і рускія) шчыра перажывалі, маліліся і выказвалі свае пачуцці. Тое, за што змагаўся Скарына, зноў становіцца актуальнай праблемай чалавецтва. Кніга паслядоўна і сістэмна выцясняецца з жыцця чалавека, скарачаецца колькасць кніжных крам, у шматлікіх раённых цэнтрах Расіі няма ніводнай кнігарні. З меркаванняў аптымізацыі закрываюцца і бібліятэкі. Кнігі выдаюцца мізэрнымі накладамі, што прыводзіць да безумернага павелічэння кошту асобнікаў і робіць іх амаль недаступнымі для людзей са сціплымі даходамі (а гэта каля 90% насельніцтва краіны). У сучасных кватэрных інтэр'ерах увогуле не прадугледжана месца для кніг: кніжная шафа ці паліца становяцца рарытэтамі. Расце новае пакаленне людзей, якія прынцыпова не разумеюць каштоўнасць кнігі і атрымліваюць асалоду выключна ад спажывання матэрыяльных выгод.

Але мне здаецца, што ў кнігі як артэфакта нацыянальнай культуры ёсць шанц выжыць у час глабалізацыі. Павінна распачацца наступленне нацыянальнага мастацтва на масавую культуру, на банальныя серыялы і кнігі кшталту «Пяцьдзясят адценняў шэрага». Напісаная таленавітым аўтарам, праілюстраваная таленавітым мастаком кніга, ў якой распавядаецца, як жывуць, што адчуваюць і пра што думаюць людзі пэўнай нацыі ў сучаснай дзяржаве, абавязкова будзе карыстацца попытам, бо народ адчувае праўду і бачыць будучыню. Якасныя, напісаныя на нацыянальных мовах кнігі дапамогуць прадстаўнікам нашых народаў адстаяць права на ўласны шлях развіцця і застацца людзьмі, таму што чалавек без кнігі — ужо не чалавек у сапраўдным значэнні слова.

Наколькі дзяржава нацыянальна арыентаваная, можна меркаваць па тым, як яна ставіцца да кніжнай справы: у гэтых адносінах Беларусь можа служыць прыкладам, у прыватнасці для Расіі. Хачу таксама дадаць, што зборнік беларускай сучаснай прозы, які мы даўно планавалі ў нашым часопісе, выйдзе ўжо ў першай палове 2017 года.

Валерый КАЗАКОЎ, пісьменнік, паэт, намеснік старшыні Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Расіі»:

— Важна, што мы пачынаем вяртацца да нашай мінуўшчыны, а гэты пласт невычэрпны. 25 гадоў таму распаўся Савецкі Саюз. Нехта называе гэта вялікай трагедыяй, нехта лічыць, што трагедыяй было яго стварэнне. Мы прыдумалі містычны вобраз постсавецкай прасторы, хоць яе не існуе: існуюць толькі пятнаццаць незалежных дзяржаў, кожная з якіх будуе ўласную незалежную, сучасную краіну. У Расіі, напрыклад, гэтае будаўніцтва адбываецца без дастатковай увагі да нацыянальнай літаратуры, але яна існуе! У ролі міратворцы тут выступае Беларусь: не толькі з прычыны, што тут жывуць памяркоўныя людзі, але і таму, што яна захавала сама сябе. Не так даўно я праехаў амаль усю Еўропу. У Італіі нас спыніў паліцэйскі і на ламаной рускай спытаў, ці не з Беларусі мы. Мы ехалі на машыне з беларускімі нумарамі, я і адказаў, маўляў, так, з Беларусі. «Я быў там, цудоўная краіна!» — адказвае паліцэйскі. «Дык а чаго спыніў?» — «Вось гэта і сказаць!» Ён не глядзіць беларускага тэлебачання і не чытае беларускіх газет, але ведае пра Беларусь. У нас засталося мала пляцовак, дзе мы можам вось так разам сустракацца, і я ўдзячны за тое, што Беларусь гэтай пляцоўкай з'яўляецца.

Святлана АНАНЬЕВА, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры і мастацтва імя Аўэзава міністэрства навукі і адукацыі Рэспублікі Казахстан:

— Мы можам доўга разважаць аб унікальнай сацыякультурнай сітуацыі ў кожнай з нашых краін, але нешта агульнае нас аб'ядноўвае і дазваляе думаць аб будучыні. Дзякуючы Выдавецкаму дому «Звязда» Францыск Скарына загаварыў на мовах народаў свету. У кожнай краіне ёсць канкрэтныя асобы, якія будуюць наша супрацоўніцтва, з іх удзелам Казахстан зрабіў свой унёсак у пераклады на казахскую, карэльскую, удмурцкую і курдскую мовы (мы ганарымся сваёй этнічнай разнастайнасцю). Наша супрацоўніцтва пераходзіць на новы ўзровень: у літаратурным праекце «Абай Кунанбаеў і яго творчасць» Беларусь будзе прадстаўлена артыкулам Міколы Мятліцкага, які пераклаў казахскага класіка на беларускую мову. Нашы літаратурныя часопісы гатовы даць пляцоўкі для публікацый беларускіх аўтараў. Я ганаруся таксама тым, што ў нашай калектыўнай манаграфіі «Сусветны літаратурны працэс XXI стагоддзя» будзе раздзел аб беларускай літаратуры, і спадзяюся на індывідуальную манаграфію, якая адлюструе беларуска-казахскія літаратурныя сувязі, бо яны ёсць.

Марат АХМЕДЖАНАЎ, дырэктар выдавецтва Hertfordshire Press у Вялікабрытаніі, арганізатар Open Central Asia Book Forum&Literature Festival:

— Скарына стаяў ля вытокаў фарміравання беларускай ідэнтычнасці праз выкарыстанне ў кнігадрукаванні беларускай мовы. Сёння мы можам бачыць, колькасці высакакласнай літаратуры на такой якаснай паліграфічнай базе не было. Наша работа ў нейкай ступені аднаўляе культурную прастору (да якой у тым ліку адносіцца Францыск Скарына), нашы кнігі часам суправаджаюць канкрэтныя прыклады аднаўлення аб'ектаў культуры. Я шмат вандрую, вывучаю помнікі архітэктуры ў Беларусі, Расіі і іншых краінах (нядаўна наведала Тураў, бачыла выдатныя будынкі і музеі) і магу сказаць, што наша літаратура спадарожнічае знаёмству з культурай іншых краін, яна запатрабавана як у Беларусі, так і ў Расіі, хоць у Беларусі працэс яе выдання лепш наладжаны. Кажуць, Беларусь перажывае культурны рэнесанс — здаецца, гэта сапраўды так.

Георгій МАРЧУК, беларускі празаік, сцэнарыст, драматург:

— Слова Скарыны натхняе нас на творчасць, нагадвае пра высокія гуманістычныя ідэі, дзеля якіх ён жыў. Існуе казка, заснаваная на дакументальным факце. Прылятае шпак вясной і не можа трапіць дадому, бо сквапны гаспадар забіў уваход у яго домік дошкай. Шпак лётаў-лётаў, а на трэці дзень прыляцеў з дзятлам, каб той прадзёўб гэтую дошку. Мы зараз, як той дзяцел: часам навязваюць татальнае знішчэнне чалавекалюбства, але мы стаім на пазіцыях, пра якія казаў Скарына: патрыятызм і папулярызацыя духоўнасці і дабрыні.

Яронімас ЛАЎЦЮС, дзіцячы пісьменнік, дырэктар выдавецтва «Тры зорачкі» з Вільнюса:

— Мне здаецца, калі б мы тут сабраліся і проста памаўчалі, нават тады атрымалі б шмат пазітыву — я адчуваю аўру, што ідзе ад арганізацыі мерапрыемства і ўвагі рэспублікі да літаратуры. На пачатку маёй пісьменніцкай дзейнасці мне казалі: «Яронімас, што ты будзеш пісаць, ужо даўно пра ўсё напісана». Што дзіўна, аказалася наадварот: новых тэм хапае — чытачоў не хапае! Наклады меншыя, але пісьменнікі пішуць начамі, друкарні працуюць у тры змены. Я пачаў друкавацца трыццаць гадоў таму. З тых часоў шмат што змянілася, сталі часта казаць: «У здаровым целе хворы дух». У Літве, напрыклад, адзін з самых вялікіх попытаў на антыдэпрэсанты, вялікі працэнт суіцыдаў. Але колькі сярод іх хворых ад нічога, якія проста кажуць: «Я не люблю сябе»? Ці ж патрэбны ў гэтых выпадках псіхолагі? Пісаць трэба больш! Каб нашы кнігі ажыццяўлялі эгатэрапію — клопат пра сябе, напаўнялі чалавека эмоцыямі. Як той казаў: «Калі няма святла ў вачах, ці можа чалавек бачыць сонца?»

Адам АХМАТУКАЕЎ, член Саюза пісьменнікаў Расіі і член Клуба пісьменнікаў Каўказа з горада Грозны:

— Пасля апошняй вайны ў Чачэнскай Рэспубліцы мы, у тым ліку літаратура, стараемся выкараскацца з даволі цяжкага становішча. Мінулыя сувязі паміж літаратарамі сышлі разам з імі, новаму пакаленню трэба будаваць усё нанова. Першым крокам на гэтым шляху стала сустрэча паўночнакаўказскіх расійскіх пісьменнікаў у Грозным. Вынікам сталі стварэнне Клуба, узаемныя пераклады і публікацыі ў літаратурна-мастацкіх часопісах. Я прадстаўляю і Саюз пісьменнікаў Чачэнскай Рэспублікі. Летась я ўдзельнічаў у форуме пяці прыкаспійскіх дзяржаў, тэмай якога быў мастацкі пераклад. У выніку я пераклаў на чачэнскую мову каля дванаццаці аўтараў, што былі апублікаваны на старонках грозненскіх часопісаў. Мы ўзаемаўзбагачаемся, бо і нашы творы публікуюцца ў іншых краінах. Учора было падпісана гагадненне аб супрацоўніцтве паміж Клубам пісьменнікаў Каўказа і Выдавецкім домам «Звязда». Мы будзем развіваць, узаемна перакладаць і публікаваць нашы творы. Думаю, хутка ў нас з'явяцца пераклады з беларускай мовы на чачэнскую.

Падчас «круглага стала» ад імя Саюза пісьменнікаў Беларусі былі ўручаны медалі за вялікі ўклад у літаратуру. Іх атрымалі Адам Ахматукаеў, перакладчыца і намеснік дырэктара Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Лю Сулін, паэт і публіцыст з Таджыкістана Таір Раджабаў і іншыя аўтары. Былі ўручаны таксама падзякі ад Міністэрства інфармацыі Беларусі за вялікі асабісты ўклад у развіццё міжлітаратурных сувязяў і актыўнае партнёрства ў арганізацыі міжнародных «круглых сталоў» «Сугучча». Іх атрымалі Святлана Ананьева, Лю Сулін, Валерый Казакоў, Юрый Казлоў, публіцыст і ганаровы консул Беларусі ў Сербіі Драгамір Карыч.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by

На «круглым стале» «Сугучча» прысутнічаў саветнік Пасольства Расіі ў Беларусі Вадзім Гусеў, які падчас свайго выступлення прынёс добрую навіну: «Гістарычна склалася, што асоба першадрукара Скарыны аб'ядноўвае культурныя прасторы нашых народаў. Расійскія вучоныя аддаюць прыярытэтную ўвагу вывучэнню кніжных збораў Францыска Скарыны і захаванню яго духоўнай спадчыны. Улічваючы важнасць свята 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, што адбудзецца ў 2017 годзе, хачу сказаць, што набліжаецца да завяршэння вырашэнне пытання аб перадачы арыгінальных выданняў Францыска Скарыны з Расійскай дзяржаўнай і Расійскай нацыянальнай бібліятэк для міжнароднай выстаўкі ў Беларусі».

Старшыня Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Расіі» Сяргей Кандыбовіч у сваю чаргу расказаў, што шматлікія арганізацыі ў Расіі ў розных формах рыхтуюцца да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання: «У верасні мы знаходзімся ў чаканні шэрагу мерапрыемстваў, звязаных з асветай. На адным з іх, на кніжнай выстаўцы ў Маскве, размесціцца не проста стэнд беларускай літаратуры, для яе тут будзе адведзена самае прыгожае і знакавае месца. Нядаўна я быў у літаратурным музеі Янкі Купалы ў Татарстане, тут класік жыў у эвакуацыі. Я быў захоплены стаўленнем да беларускага літаратара. Нам трэба выкарыстаць магчымасць адкрыць у цэнтральных кніжных магазінах Расіі аддзелы беларускай літаратуры, што несумненна будзе запатрабавана. Праект «Сугучча» будзе нашым сумесным сцягам прапаганды літаратуры, гэта і наш абавязак».

ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «ХАЙ ЗІМА БУДЗЕ ЦЁПЛАЙ!»

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Хай зіма будзе цёплай!» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 8 верасня па 31 снежня 2016 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2016 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, УНП 100155376.

II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Хай зіма будзе цёплай!» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — і складаецца з наступных рэчаў:

№ п/п	Назва	Колькасць (шт.)	Цана за шт. з ПДВ, руб. (да дэнамінацыі/пасля дэнамінацыі)	Усяго з ПДВ, руб. (да дэнамінацыі/пасля дэнамінацыі)
1	**Сякера-калун Startul SE2021-10**	7	498 800/49,88	3 491 600/349,16
2	**Бензапіла ланцуговая Husqvarna 236**	1	3 890 000/389,00	3 890 000/389,00

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Хай зіма будзе цёплай!» складае: да дэнамінацыі — 7 381 600 (сем мільёнаў трыста восемдзесят адна тысяча шэсцьсот) рублёў; пасля дэнамінацыі — 738,16 (семсот трыццаць восем рублёў 16 капеек).

III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «Хай зіма будзе цёплай!» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2016 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які афарміў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2016 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас установы ў перыяд з 8 верасня па 11 кастрычніка 2016 года выразаная з газеты або з укладыша ў газету запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 8 па 30 верасня 2016 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі ўстанове пасля 13 кастрычніка 2016 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

9. Для правядзення Гульні ўстанова стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні «Хай зіма будзе цёплай!» (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна — начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Міхайлічэнка Алена Віктараўна — загадчык аддзела маркетынгу рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Сянько Аляксандр Анатолевіч — спецыяліст 1 катэгорыі адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 14 кастрычніка 2016 года ў 12 гадзін у памяшканні ўстановы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца 7 сякер-калуноў (па адной для кожнага).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз — бензапіла.

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні або прадстаўнікоў незалежных арганізацый. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 24 кастрычніка 2016 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 24 кастрычніка 2016 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

16. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал або другое паўгоддзе 2016 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал або другое паўгоддзе 2016 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал або другое паўгоддзе 2016 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы выдаюцца пераможцам у тэрмін па 31 снежня 2016 года ў памяшканні ўстановы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, за выключэннем выхадных і святочных дзён. Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза, установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

20. Пасля 31 снежня 2016 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за падачу падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фотаздымкі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны ўстановай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, звязаных з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць установе.

23. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Хай зіма будзе цёплай!» да яе пачатку будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне (017) 284 44 04.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №2818 ад 01.09.2016 г., выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Вишнёвка-2010» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества в составе:

ЛОТ № 1. Мастерские реммехсектора, инв. № 600/С-128957, общ. пл. 1178 кв.м; **гаражный бокс реммехсектора,** инв. № 600/С-128582, общ. пл. 863,9 кв.м; **навес для с/х машин реммехсектора,** инв. № 600/С-128536; **склад запчастей и ядохимикатов реммехсектора,** инв. № 600/С-128548, общ. пл. 268,9 кв.м; **автозаправочная станция реммехсектора,** инв. № 600/С-129106; **проходная реммехсектора,** инв. № 600/С-128554, общ. пл. 24,5 кв.м, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 623688200001000330 площадью 2,7640 га *(предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для ведения товарного хозяйства)* по адресу: Минская область, Минский район, Юзуфовский с/с, д. Угляны.

Начальная цена с НДС (20%) – 864 524,40 бел. руб. (8 645 244 000 бел. руб. – в денежных единицах 2000 года). Задаток 10% от начальной цены – 86 452,44 бел. руб.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) по лоту № 1 оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 1 (одного) процента от окончательной цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона.

ЛОТ № 2. Бокс для хранения техники с ее обслуживанием, инв. № 600/С-129088, общ. пл. 2063,8 кв.м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 623688200001000137 площадью 0,6148 га *(предоставлен на праве постоянного пользования для ведения товарного хозяйства)* по адресу: Минская область, Минский район, Юзуфовский с/с, д. Угляны.

Начальная цена с НДС (20%) – 597 969,12 бел. руб. (5 979 691 200 бел. руб. – в денежных единицах 2000 года). Задаток 10% от начальной цены – 59 796,91 бел. руб.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) по лоту № 2 оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 1 (одного) процента от окончательной цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона.

Задатки перечисляются на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **07.10.2016 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 06.10.2016 до 16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.

ОАО «ЛИФТСЕРВИС»

(место нахождения: г. Минск, Велосипедный пер., 5, 7-й и 8-й этажи)

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

Собрание состоится 28 сентября 2016 г.

по адресу: г. Минск, Велосипедный пер., 5, 4-й этаж, актовый зал. Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 13.00 до 14.15. Начало работы собрания в 14.30.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О выплате дивидендов за I полугодие 2016 года.
2. О согласовании внесения в виде неденежного вклада в уставный фонд ОАО «ЛИФТСЕРВИС» изолированных помещений, находящихся в собственности г. Минска.
3. Об увеличении уставного фонда ОАО «ЛИФТСЕРВИС» путем выпуска дополнительных акций, размещаемых путем проведения закрытой подписки.

Для регистрации участнику собрания необходимо предъявить документ, удостоверяющий личность, а также, если необходимо, документы, подтверждающие его полномочия: доверенность и/или другие документы в соответствии с действующим законодательством.

Ознакомление лиц, имеющих право на участие в собрании, с информацией, предоставляемой при подготовке к проведению собрания, осуществляется в рабочие дни и в рабочее время по месту нахождения общества (тел.: 298 25 16, 298 29 68), а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Дата формирования реестра акционеров ОАО «ЛИФТСЕРВИС» для составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – 01 сентября 2016 года.

Наблюдательный совет общества.

УНП 100088852

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЯ

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта	Право заключения договора аренды сроком 3 года капитального строения, инв. № 420/С-26756 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – административное здание с гаражом (автобаза)), общей площадью 643.3 кв.м по адресу: г. Лида, ул. Труханова, 34
Начальная цена продажи	2 187,22 р. (две тысячи сто восемьдесят семь рублей двадцать две копейки) с учетом НДС
Коэффициент к базовой арендной величине по договору аренды	2,5
Сумма задатка	218 р. (двести восемнадцать рублей)
Условия аукциона	Целевое назначение арендуемых помещений – для размещения склада, гаража, производственного помещения, офиса
Продавец	УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» Барановичская дистанция гражданских сооружений, 225407, г. Барановичи, ул. Вильчковского, 5, тел. 8-0163-42-25-08
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора аренды	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225
Аукцион состоится 10 октября 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3	

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
- *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
- *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
- *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

- представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
- физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;
- представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)

Последний день приема заявлений – 04 октября 2016 г. до 15.00

Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
